ТОЛЬКІ НАПЕРАД

Сёння ў цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх людзей горада і вёскі важная падзея ў жыцці нашай краіны, ды і не толькі нашай, — Пленум ЦК КПСС. Пытанні далейшага ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі хвалююць і цікавяць не толькі працаўнікоў вёскі, але і ўвесь савецкі народ. Рашэнні Пленума ўнясуць шмат новага ў наша жыццё, будуць натхняць савецкіх людзей працаваць яшчэ лепш, каб найхутчэй здзейснілася тое, пра што ў свой час пісаў Уладзімір Маякоўскі:

... хутканогую
славутую Амерыку
мы
і дагонім
і перагонім.

Што ж сёння можна сказаць пра гэтыя словы паэта-патрыёта, які так моцна верыў у патэнцыяльныя сілы вызваленага народа? Мы сапраўды паспяхова даганяем «хутканогую Амерыку», і хутка надыйдзе час, калі ў мірным спаборніцтве са Злучанымі Штатамі савецкія людзі дагоняць і перагоняць іх па вырабу прадукцыі на душу насельніцтва.

Значыць, не так ужо блага працуе беларускае калгаснае сялянства, калі за першы год сямігодкі вытворчасць мяса ў калгасах і саўгасах рэспублікі павялічылася прыкладна на столькі, на колькі яна вырасла за папярэднія чатыры гады. І яшчэ нагадаем адзін факт: Беларусь датэрмінова выканала план закупак прадукцыі паляводства і жывёлагадоўлі.

Плён руплівай працы адчувальны на кожным кроку: расце эканоміка калгасаў і саўгасаў, расце культура вёскі. Прыязджайце ў любы пасёлак, у любую вёску рэспублікі — і вы абавязкова ўбачыце гэтыя радасныя змены ў побыце нашага сялянства: і электрычнасць, і радыё, і клубы. Газеты і часопісы ёсць цяпер амаль у кожным доме, у кожнай сям'і калгасніка. Гаспадыня, якая пражыла ўсё жыццё з газоўкай, цяпер кажа: «А як жа можна без электрыкі?! З ёю і жыць весялей, і нават твар чалавека інакш выглядае — ён неяк адразу святлее і дабрэе». А колькі новых прыгожых і прасторных дамоў пабудавана на вёсцы! Ды такога нашы сяляне не зрабілі б і за стагоддзе, каб у краіне і сёння панавалі памешчыкі і капіталісты.

Наша вёска цяпер не тая, і людзі не тыя, якімі яны былі раней. Умацоўваецца грамадская гаспадарка калгасаў, растуць даходы калгаснікаў, а значыць непазбежна будзе знікаць роля іх асабістай падсобнай гаспадаркі, скарачацца колькасць уласнай жывёлы, змяншацца памеры прысядзібных участкаў. Наш абавязак — зрабіць з гэтых новых з'яў правільныя вывады. Жыццё настойліва вылучае на парадак дня будаўніцтва калгасных пякарань і сталовых, дзіцячых ясляў і садоў, школ-інтэрнатаў і лазняў, майстарань бытавога абслугоўвання. Усё гэта максімальна вызваліць калгаснікаў, і перш за ўсё жанчын, ад хатняй працы, дасць ім магчымасць больш актыўна працаваць у грамадскай гаспадарцы.

Гэтая работа ў рэспубліцы праводзіцца ўжо. За 10 месяцаў 1959 г. калгасы пабудавалі 200 клубаў, 119 школ, звыш 19 тысяч новых дамоў. У гэтым сэнсе павучальны прыклад калгаса імя Леніна Мсціслаўскага раёна. За апошнія тры гады ў калгасе пабудаваны два клубы, якія маюць стацыянарныя кінаўстаноўкі, тры пачатковыя школы, аддзяленне сувязі, пяць лазняў. Заканчваецца будаўніцтва бальніцы. Калгас дапамагае сваім лепшым працаўнікам будавацца. Забудоўшчыкам выдаюцца крэдыты на пяць—дзесяць год. Сёлета за кошт калгаса пабудаваны 74 дамы.

У новым 1960 г. калгаснікі сельгасарцелі імя Леніна з большай настойлівасцю і паслядоўнасцю будуць працягваць распачатую справу. Яны мяркуюць пабудаваць яшчэ ў чатырох брыгадах яслі і клубы, адкрыць цэх бытавога абслугоўвання, распачаць будаўніцтва калгаснага дома адпачынку. Па плану, распрацаванаму праўленнем арцелі, да 1962 г. усе калгаснікі будуць жыць у новых прасторных дамах.

Справа, распачатая ленінцамі, заслугоўвае самага шырокага перайманння. Час ужо добраўпарадкаваць і азеляніць калгасныя вуліцы і дароги, разбіць скверы, пасадзіць наўкол сады.

Калгаснікі працуюць старанна. Значыць, трэба паклапаціцца аб іх далейшым прафесіянальным і культурным росце. Які шырокі прастор для плённай творчай дзейнасці адкрываецца цяпер перад работнікамі культуры, літаратуры і мастацтва Беларусі. Сёння мы друкуем паведамленне аб тым, што калектывы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры выканалі сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар Пленума ЦК КПСС. Значыць, больш у нас стала кніг, лепш мы абслугоўваем сельскага кінагледача, больш увагі надаюць бібліятэкі прапагандзе кнігі на вёсцы, тэатры і канцэртныя арганізацыі рэспублікі палепшылі абслугоўванне сельскага насельніцтва. Усё гэта не можа не радаваць кожнага чалавека, які цягнецца да ведаў, да культуры.

Але трэба памятаць, што зробленае — не мяжа, а толькі першы крок у нашай пачэснай і важнай справе па камуністычнаму выхаванню працоўных. Работнікам культуры трэба працаваць значна больш і лепш, а галоўнае — набліжаць дзейнасць устаноў культуры і мастацтва да жыцця, да надзённых спраў народа, быць заўсёды актыўнымі памочнікамі партыі ва ўсіх яе высакародных імкненнях і пачынаннях. Між тым многім яшчэ установам культуры рэспублікі не хапае ініцыятывы, таго самага творчага агеньчыку, ад якога цяплей становіцца на сэрцы чалавека і хочацца горы перавярнуць, але дасягнуць пастаўленай мэты.

Пачэсныя задачы стаяць цяпер перад работнікамі культуры. Яны абавязаны разам са сваім шматлікім актывам штодзённа дапамагаць нашым калгасам і саўгасам павышаць культуру земляробства і жывёлагадоўлі, паспяхова выконваць пастаўленыя перад сельскай гаспадаркай задачы.

Або возьмем яшчэ адно пытанне. Расце ўзброенасць сельскай гаспадаркі сучаснай тэхнікай. Галоўнай фігурай цяпер на вёсцы з'яўляецца механізатар. У брыгады і на фермы ідзе моладзь, якая мае сярэднюю адукацыю. Гэта выдатныя людзі, дапытлівыя, смелыя, якія аддаюць усю сваю маладую энергію справе ўмацавання калгасаў. Трэба дапамагчы ім лепш авалодаць тэхнікай, набыць кваліфікацыю. Уся сельская моладзь павінна цяпер навучыцца працаваць на любой машыне, на трактары і камбайне, на аўтамабілі, умела карыстацца сучаснай тэхнікай.

Дзе павінен быць у гэты час работнік культуры? На перадавым рубяжы сямігодкі. Авалодаць машынай заўсёды дапаможа кніга. Дык забяспеч, бібліятэкар, гэтую моладзь патрэбнай літаратурай, парай, дзе і што прачытаць, наладжвай канферэнцыі чытачоў па тэхнічных пытаннях, вечары лепшых механізатараў, шырока прапагандуй перадавы вопыт і дасягненні сельскагаспадарчай навукі. Ды хіба ўсё можна пералічыць! Ініцыятыве тут шырокае раздолле. Тады забурліць жыццё ва ўстанове культуры, у ёй будзе заўсёды мнагалюдна, бо культасветработнік знайшоў сваё сапраўднае месца ў жыцці.

Наш народ багаты талентамі. Колькі іх яшчэ нявыяўленых і непрызнаных? Усе яны любяць песні, музыку, тэатр і ахвотна займаюцца ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Але дапамажыце, таварышы пісьменнікі і кампазітары, калгасным артыстам! Дайце ім надзённы, высокамастацкі рэпертуар.

І, нарэшце, як удзячны будуць сельскія працаўнікі, калі часцей на старонках нашых газет і часопісаў будуць з'яўляцца цікавыя нарысы, вершы, апавяданні, аповесці і раманы аб калгаснай вёсцы. Нельга сказаць, што іх у нас няма. Яны ёсць. Але як часта творы аб калгаснай вёсцы праходзяць міма галоўнага, чым жывуць сёння калгаснікі, што іх хвалюе і непакоіць, што радуе і захапляе.

Толькі наперад кліча нас партыя. І мы, яе радавыя байцы — работнікі літаратуры, культуры, мастацтва, будзем працаваць так, каб здзейсніць усе планы партыі — хутчэй наблізіць камуністычнае грамадства.

Слова стрымалі

Міністэрства культуры БССР днямі падвяло вынікі выканання калектывамі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры рэспублікі сацыялістычных абавязацельстваў, узятых імі ў гонар снежаньскага Пленума ЦК КПСС.

Паліграфічныя прадпрыемствы рэспублікі яшчэ 12 снежня выканалі план выпуску валавай прадукцыі. Да канца года краіна атрымае прадукцыі звыш плана на 4,3 мільёна рублёў. Колькі гэта будзе новых кніг, сшыткаў, блакнотаў! Падкрэслім, што сабекошт прадукцыі зніжаны звыш плана на 2,1 млн. рублёў, у тым ліку на Мінскім паліграфічным камбінаце імя Якуба Коласа на 928 тысяч рублёў і ў мясцовых друкарнях— на 600 тысяч рублёў. Заданне па прадукцыйнасці працы перавыкананa на 5,3 працэнта.

На прадпрыемствах паліграфічнай прамысловасці рэспублікі 82 брыгады змагаюцца за права называцца брыгадамі камуністычнай працы. Дзевяць брыгад гэтае ганаровае званне ўжо носяць. Адна з лепшых брыгад друкароў на паліграфкамбінаце на чале з Н. Важнікам гадавы план выканала да 42-й гадавіны Кастрычніка.

Па ініцыятыве наборшчыцы Пружанскай раённай друкарні А. Кісялевіч упершыню ў нашай краіне асвоен набор дзвюма рукамі. Цяпер калектыў друкарні на многа перавыконвае вытворчы план. У рэспубліцы ўжо ёсць нямала паслядоўнікаў пружанцаў.

Многія з новых кніг, што з'явіліся за апошні час у нашых кнігарнях, выдадзены Дзяржаўным выдавецтвам БССР, якое гадавы план па назвах выканала на 106 працэнтаў яшчэ 1 снежня. За апошнія месяцы выпушчана ў свет тыражом 102 тысячы экземпляраў 17 кніг і брашур па пытаннях далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Праведзены мерапрыемствы па зніжэнню сабекошту нашых газет, часопісаў і кніг. Гэта дало магчымасць зберагчы для дзяржавы 3,1 мільёна рублёў.

Добра працаваць і работнікам кнігагандлю, калі ў іх багаты выбар літаратуры. Гадавы план яны выканалі 21 снежня на 112 працэнтаў. Умела наладзілі продаж кніг работнікі Гомельскага аблкнігагандлю, мінскага Цэнтральнага кніжнага магазіна і магазіна падпісных выданняў. У гэтым годзе ў рэспубліцы адкрыта пяць новых кнігарань. 26 кіёскаў. 17 магазінаў перайшлі на беспрылавачную работу.

І снежня 1959 г. выканан план развіцця дзяржаўнай кінасеткі на 107,7 працэнта. Кінагледачоў абслугоўвала 531 новая кінаўстаноўка, гэта на 38 больш, чым прадугледжвалася планам.

На вёсцы шырокае распаўсюджванне атрымалі сельскія кінастацыянары, якіх цяпер у рэспубліцы працуе 1 000. Сельскага гледача абслугоўваюць таксама чатыры шырокаэкранныя перасоўкі і 46 перасовак дзённага паказу.

Новыя шырокаэкранныя кінатэатры адкрыты ў Мінску, Брэсце, Нова-Беліцы, Слуцку, Кобрыне і Слоніме, а ўсяго ў гэтым годзе ў рэспубліцы пабудавана 14 кінатэатраў, пяць раённых дамоў культуры і дзве фільмабазы.

За 11 месяцаў бягучага года кіно наведала каля 75 мільёнаў гледачоў. Дзяржаўная кінасетка рэспублікі паставіла 56 тысяч сеансаў сельскагаспадарчых фільмаў. Гэта на 33 тысячы сеансаў больш, чым у мінулым годзе.

21 снежня гадавы план валавага збору выканалі Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Маладзечанская вобласці. Не выканалі планаў Брэсцкая і Мінская вобласці і горад Мінск.

Шырокі водгук і гарачую падтрымку сярод сельскіх кінамеханікаў знайшоў патрыятычны пачын Валянціны Гаганавай. Першымі працаваць на адстаючыя маршруты перайшлі перадавыя кінамеханікі Іванаўскага раёна А. Мароз, Г. Лісюк і Брэсцкага—І. Руднічук. Цяпер 24 кінамеханікі падцягваюць да ўзроўню перадавых тыя маршруты, дзе ніколі не выконваліся планы.

Кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла ў 1959 г. тры мастацкія фільмы—«Дзяўчынка шукае бацьку», «Строгая жанчына» і «Каханем трэба даражыць». Закончана вытворчасць 13 навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных кінанарысаў, у тым ліку першы шырокаэкранны нарыс «Краявіды роднага краю». На паўтара месяцы раней тэрміну кінастудыя асвоіла выпуск кінажурналаў на негаручай плёнцы.

Ажывілася работа культурна-асветных устаноў рэспублікі. Прачытана звыш 180 тысяч лекцый і дакладаў, у тым ліку 48 тысяч лекцый па прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў і вопыту перадавікоў. У сельскіх клубах наладжваюцца вечары ў гонар лепшых даярак, свінарак, кукурузаводаў і інш. У рэспубліцы цяпер ёсць каля 15 тысяч калектываў мастацкай самадзейнасці, у якіх удзельнічае звыш 230 тысяч чалавек.

Паслугамі дзяржаўных і калгасных бібліятэк карыстаецца большасць калгаснікаў. У Талачынскім раёне ва ўсіх сельгасарцелях створаны калгасныя бібліятэкі. У Брэсцкай вобласці кожны калгас мае калектыў мастацкай самадзейнасці.

У рэспубліцы створана дзесяць народных тэатраў, восем самадзейных сімфанічных і народных аркестраў, пяць калгасных музеяў, працуюць 77 універсітэтаў культуры і 90 лекторыяў.

Тэатры Беларусі паставілі ў гэтым годзе 76 новых спектакляў. Лепшыя з іх—«Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна ў Тэатры імя Я. Купалы, «Навальніца будзе» А. Звонака, «Бітва ў дарозе» Г. Нікалаевай і С. Радзінскага ў Тэатры імя Я. Коласа, «Барабаншчыца» А. Салынскага ў Рускім тэатры імя М. Горкага. Тэатры рэспублікі паставілі сем новых п'ес беларускіх аўтараў.

Да 1 снежня гледачам паказана 5 764 спектаклі і 4 518 канцэртаў. На іх пабывала звыш чатырох мільёнаў гледачоў. Для сельскага гледача прафесіянальныя тэатральныя калектывы паставілі 2 788 спектакляў і канцэртаў. Брэсцкі абласны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі (дырэктар тав. Валчэцкі) і Гродзенскі абласны драматычны тэатр (дырэктар тав. Міхалюта) выканалі фінансавыя планы.

За гэты год наладжана чатыры стацыянарныя і пяць перасоўных мастацкіх выставак. У 1959 г. вышэйшыя і сярэднія музычныя навучальныя ўстановы разам з курсамі падрыхтавалі 1 160 спецыялістаў для прафесіянальных творчых калектываў і калектываў мастацкай самадзейнасці. Цяпер на курсах кіраўнікоў харавых, драматычных, танцавальных калектываў і баяністаў-масавікоў займаецца 819 чалавек.

Калектывы прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры рэспублікі будуць і далей дапамагаць народу, партыі паспяхова ажыццяўляць рашэнні XXI з'езду КПСС, змагацца за датэрміновае выкананне сямігадовага плана, выхоўваць савецкіх людзей актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 102 (1418) | Субота, 26 снежня 1959 года | Цана 40 кап.

Шчыра, ад душы...

Аркадзь ЧАРНЫШЭВІЧ

Мабыць кожная размова пры сустрэчы старых знаёмых, якія не бачыліся больш года, пачынаецца словамі: як жывеш, ці як жывяце? Так пачалася размова і ў мяне са старымі знаёмымі калгаснікамі на нарадзе ў раённым Доме культуры. Аднаго з іх завуць Сцяпан Гарэліч. Гэта стары гадоў шасцідзесяці. Калісьці Сцяпан Гарэліч быў моцны гаспадар-хутаранін. Другі — Антось Гарбоўскі. Мы з ім аднагодкі. Ён высокі, шырокі, дужы, з вялікім вясёлым тварам, старанна паголены.

Пасля першых агульных фраз мужчыны разгаварыліся пра Пленум ЦК КПСС. Пастановы партыі і ўрада аб развіцці сельскай гаспадаркі знайшлі гарачы водгук у сэрцах калгаснікаў, натхнілі іх сваёй мэтанакіраванасцю.

— Цяпер у нашым калгасе не тое, што было, — пачынае Антось Гарбоўскі.—От і Пленум як бы па нашаму калгасу сказаў: жывём інакш. Прастор адчулі! Цяпер жа наш калгас гэта табе, браце, тэры-торы-я! Я чуў, што дзяржавы меншыя ёсць...

Сцяпан Гарэліч фыркае.

—Не фыркай! Я гэта да таго кажу, што ёсць дзе разгарнуцца. Ёсць дзе месца выбраць і для ільну, і для кукурузы, і для канюшыны. І для садоў! Бо мы і саду насадзілі плошчу! А тэхніка? Яна ж у нас свая, уласная. Не будзеш круціцца на трактары. Ды братка ты мой! Раней мы машыны выкарыстоўвалі дзе? На сезоннай рабоце. Ну, на сяўбе, на ўборцы, на малацьбе. А цяпер мы, братка, угнаенне возім столькі, колькі нам трэба, не толькі мінеральныя са станцыі, але і свае: гной і торф. Вось табе і ўраджай. А будаўнічыя матэрыялы. Не толькі цэмент, шкло ды жалеза, але і лес ды цэглу. Вось і будаўніцтва пайшло на поўны ход...

— Не вельмі хваліся,—перабівае яго Сцяпан Гарэліч,—бо і ў нас не горш. Толькі я не з вялікага пачну, а з малога. У нашай брыгадзе ёсць такая Наталля. Што гэта за гультайка была, свет не бачыў. У калгас на работу яе палкай нельга было выгнаць. Іншы раз такая тэрміновая работа, што хоць парвіся, людзей не хапае, дык проста ўпрошваць яе даводзілася. Потым ужо брыгадзір і хадзіць да яе кінуў. Бывала знарок, для смеху, пастукае ў акно: «Наталля! Ідзі бульбу выбіраць!» То яна галаву высуне і адкажа: «Ідзі ты да ліхой матары! Трэба мне ваша бульба!». «Не нашу бульбу, Наталля! Сваю!—кажа брыгадзір.—Сваю выбірай, а то зазімуе! Каня я табе не дам разворваць». «Не трэба мне твой конь! Абыйдуся!» Як яна жыла, не разумею. Трое дзяцей. Круцілася, а не жыла. Чым толькі не займалася! Ну, і крала таксама. Цягнула пакрысе і з калгаснага поля, і з гумна. А цяпер гэтая Наталля—першая работніца. Паспрабуй ёй работы не даць, дык яна вочы гатова выдраць.

— У чым жа прычына?—пацікавіўся я.—Чаму так перамянілася ваша Наталля?

— Працадзень не дарэмны, от у чым прычына. Хоць ён яшчэ і невялікі ў нас, але і не дарэмны. Таму людзі і на работу ідуць, і хочуць больш зарабіць. Цяпер не трэба ў вокны стукаць ды па пяць разоў у адну хату заходзіць. Людзі самі ідуць. А то ж бывала прыйдзеш ты на работу, дык цябе па каня адсылаюць. Зімой з хлява яго возьмеш. А ён жа, бедны, не вельмі пад'еўшы... А летам з пашы. А якая там паша! Аб той пашы ды ў плуг ці ў калёсы... А вупраж! Хамуты без гужоў. А калі з гужамі, то адзін з вяроўкі, другі з лыка. А калёсы! Перадок у адным месцы, а задок у другім. Не мазаныя.

— А цяпер?

— А цяпер! Ты ж чуў, што гаварыў Антось. Тут, браце, адно з другім звязваецца. І тэрыторыя, як кажа Антось, і тэхніка. Ураджай узняўся. Ёсць угнаенні, ёсць і ўраджай. Ёсць ураджай, ёсць і кармы, а калі ёсць кармы, то ёсць малако і мяса. Кукуруза! Яна, браце, нас узняла. Кукурузны сілас, гэта табе не асака і не саломка. Цяпер канюшына. Яе таксама трэба ўзнімаць, як і кукурузу. Гэта ж наша расліна, догляду не патрабуе, і глеба пасля яе лепш родзіць. Дык, як бачыш, адно з другім звязваецца, толькі трэба, каб было каму разумна звязваць. Кіраўніцтва трэба. Калі калгаснікі бачаць, што іх старшыня чалавек правільны, то яны заўсёды за ім пойдуць. Памыліцца—паправяць. Хто ж больш зацікаўлены ў тым, каб калгас быў багаты, каб добра жылося, калі не мы! Абяцанкамі чалавека не задаволіш, яму трэба жыць кожны дзень. Ты пытаеш, чаму Наталля перамянілася. Авансіроўка памагла.

— Так! — падтрымлівае Антось Гарбоўскі. — Авансіроўка памагла. Крадзяжу менш стала. А то, нашто таіцца! Было! Вырасце мала, дык і таго палову ўкрадуць. Вядома, і цяпер яшчэ ёсць, крадуць некаторыя. Ды гэта ўжо сапраўдныя зладзеі, такіх мілаваць не трэба. Такі крадзе не дзяцей накарміць, а каб самому горла заліць гарэлкай. А ў нас яшчэ хаваюць іх. Сусед, маўляў. А такі сусед найгоршы вораг. Гэта трэба ўлічыць кіраўніцтву і не мілаваць зладзеяў ні малых ні вялікіх. І от яшчэ адно, на маю думку, не зусім добра... Пленум акурат ідзе, быў бы там, дык і там сказаў бы. Пастаянныя работнікі, ну, скажам, тыя, што на фермах, зарабляюць добра. Сцяпан казаў, што на фермы не хацелі ісці рабіць. Цяпер ідуць! Моладзь з дзесяцігодак ідзе. Бо налічваюць ім многа. Ім улічваюць усё, і прыплод, і нагул жывёлы... Прэміруюць. А от такія, як я, што сёння касец, заўтра араты, а паслязаўтра ўгнаенні важу, то такім горш. А хіба Фермы без нас абыйшліся б? Не.

— Праўда, — кажа Гарэліч. — Пастушок, што цяляты пасе, зарабляе больш, чым араты. Яму кожны дзень—працадзень. А ў таго, што на розных работах, не на кожны дзень па працадню выйдзе. Гэта яшчэ як след не ўлічана... Не ўлічана і тое, што ў нашых калгасах яшчэ падсуседзі ёсць. Няўдалыя падсуседзі...

— Што гэта за падсуседзі?—пытаюся я.

— Слухай. Далёка не будзем хадзіць. Вунь на чыгуначнай станцыі сямейка адна жыве. Галава ў гэтай сямейкі крыху малодшы за мяне. Ён, браце, у Баярах жыве, а сам у Мінску ў прадуктовым магазіне працуе рабочым. Гэта значыць, прынесці поўныя скрынкі, а вынесці пустыя. Таксама і бочкі з селядцамі ці рыбай. Штодзень у Мінск і з Мінска. Дачка яго ўдава, сына мае. Сын вучыцца. А яна ў Мінску ў нейкай бальніцы санітаркай робіць. Таксама туды-сюды ездзіць. Ды ліха іх бяры, няхай ездзяць... Дачка прымака ўзяла. Ён нікуды не ездзіць, бо на месцы на чыгунцы робіць. Адным словам, усе робяць, толькі старая дома. Яна самагонку гоніць. Дык скажы ты мне, якое дачыненне мае гэтая сям'я да калгаса? Ніякага! Прышый кабыле хвост! А сотак яны маюць аж шасцьдзесят. Трымаюць дзве каровы. Сена таксама на нашай калгаснай зямлі косяць. От табе і падсуседзі. А на што яны? Або няхай ідуць усе ў калгас, або соткі адабраць. Бо такія падсуседзі ў калгаснікаў, як бяльмо на вачах.

— Я табе яшчэ бліжэйшы прыклад дам, — кажа Антось Гарбоўскі. — Вазьмі наш калгас. Ён жа цэнтральны, раённы. Дык тут, у мястэчку, у самым раёне, пад носам у начальства такія жывуць гаспадары, што невядома, як іх і назваць. Коней трымаюць. Зарабляюць на іх добра. Зямлю аруць. Не толькі бульбу садзяць, але жыта ды пшаніцу сеюць. Нават канюшыну. Хто яны? Рабочыя? Не. Калгаснікі? Не. Проста аднаасобнікі...

— Так, так!—дадае Гарэліч. — Сапраўдныя аднаасобнікі. Вось пра іх дык варта пагаварыць, калі не на Пленуме, то хоць тут, на месцы: у раёне, на калгасным праўленні. Ды хоць сабе на калгасным сходзе.

Мы выйшлі з залы ў вестыбюль пакурыць і там селі. Я задаю Гарэлічу пытанне, і ён увесь натапырваецца.

— Што?—пытаецца ён.—Ці ўзяў бы я тую зямлю, што ў мяне была? Жартуеш, чалавек! Нашто яна мне! Я цяпер лепш жыву! Го! Ты не быў у маёй хаце? Зайдзі, паглядзі! У мяне, браце, абстановачка! Старыя драўляныя ложкі я папаліў. У мяне цяпер нікеліраваныя, на спрунжынах! Два веласіпеды: у сына і нявесткі. Швейная машына. Радыёпрыёмнік. Нявестка даяркай працуе, а сын, як і ты, Антось, на розных работах. Дык яны на работу з гадзіннікамі ходзяць. Форс! А сам я? І сам хаджу, хоць і ўнукаў ужо маю. Гадзінніка з сабой не бяру, але думаеш няма? Ёсць! А за панскай Польшчай, што я меў? Толькі што зямлю. І круціўся на ёй, як бяроста на агні... Цяпер мая жонка толькі хатняя справы ведае ды ўнукаў гадуе. Сын з нявесткай пасля работы ў клуб ходзяць. Там яны спяваюць ды скачуць, спектаклі ставяць. А раней гэтых баб адзін лён задушыў бы. Чым мы раней адзяваліся? Крамнага не быю за што купляць. І святочнае і будзённае ўсё сваё. Прасніца ды кросны век жаночы скарачалі на палову. А зямля наша нікому чужому не дасталася. Самі на ёй жывём і робім.

Стары нешта ўспамінае і дадае:

— У нас яшчэ таму дрэнна, што святла няма, электрыка не праведзена. Гэта трэба ўлічыць. Без электрыкі не жыццё. Яна і для святла і для гаспадаркі патрэбна. Уключыў бы маторчык і дровы пілуй, сечку рэж. А я тады радыёлу купіў бы. Слухаў бы ўвесь наш Саюз. Дзе, у якім горадзе лепшы канцэрт, туды і наводзіў бы. А то дома ў мяне сварыкі бываюць. Я люблю вясёлую музыку і сур'ёзныя перадачы пра сельскую гаспадарку і прамысловасць. Пра навуку. Нявестцы давай сімфоніі, санаты розныя і іншае. А сын, калі перадаюць пра футбол і іншыя фізкультурныя штукі, дык, лёгшы спаць, не пляную ецца з ложка ўстаць ды падкруціць, каб мацней гаварыла. Маладыя!..

(Заканчэнне на 2-й стар.)



Рабочыя саўгаса «Белавежскі» Камянецкага раёна не ўяўляюць сабе адпачынку без клуба. Асабліва цяпер, у дні работы Пленума ЦК КПСС, людна ў Камянюкскім сельскім Доме культуры. Што гаворыць мудрая Ленінская партыя аб далейшым развіцці сельскай гаспадаркі — гэтым асабліва цікавяцца працаўнікі вёскі. Узрос попыт чытачоў на беларускую літаратуру.

На здымку: у бібліятэцы Камянюкскага сельскага Дома культуры. Бібліятэкар Тацяна **Аўрамава** выдае кнігі цесляру саўгаса «Белавежскі» Івану **Лук'янаву** і калгасніцы сельгасарцелі «Бальшавік» Зінаідзе **Шахалевіч.**

Фота **В. Германа.**
Фотахроніка БЕЛТА.

Для ўпрыгожання быту

У цэнтральным фірменным магазіне Белмастакрамсаюза наладжана выстаўка-продаж шматлікіх мастацкіх вырабаў. Гэтая выстаўка карыстаецца вялікім поспехам у працоўных сталіцы Беларусі напярэдадні навагодняга свята.

Арцелі імя Крупскай (Магілёў), «XX год Кастрычніка» (Мінск), «8-е сакавіка» (Віцебск) выпусцілі для продажу ў перадсвяточныя дні выдатна вышытыя плашчі, блузкі, мужчынскія кашулі, абрусы, дарожкі...

Вялікім попытам карыстаюцца на выстаўцы шкляныя ёлачныя цацкі, выпушчаныя мінскай арцеллю «Трэцяя пяцігодка». Радуе вока разнастайнасць сюжэтаў, яркасць расфарбоўкі многіх гэтых цацак. Тут жа ўвагу наведвальнікаў прыцягваюць вырабы з керамікі арцелі імя Дзяржынскага (Івянец). Рознакаляровыя паліваныя збаны, вазы, графінчыкі, чашкі і інш. сведчаць, што развіццё мастацкага промыслу ў нас значна палепшылася. Прыгожыя разьба па дрэву і вырабы, інкруставаныя каляровай саломкай (мінская арцель «Культпром» і жлобінская «XVIII партз'езд»).

У 1959 г. фірменны магазін у Мінску прадаў насельніцтву розных мастацкіх вырабаў больш чым на 11 мільёнаў рублёў.

А. БАГДАНОВІЧ.

Фестываль беларускіх фільмаў

У гонар 41-й гадавіны Беларускай ССР брэсцкі кінатэатр «Першае мая» праводзіць фестываль беларускіх фільмаў. Працоўныя горада здолеюць праглядзець творы беларускай кінематаграфіі: «Пяюць жаваранкі», «Шчасце трэба берагчы», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Чырвонае лісце», «Пасеялі дзяўчаты лён», «Канстанцін Заслонаў» і інш.

Б. ЗІНКЕВІЧ.

Аб дружбе і каханні

«Пагаворым аб каханні і дружбе»—літаратурны вечар на такую тэму адбыўся ў Палацы культуры Аршанскага ільнокамбіната. З вялікай цікавасцю праслухалі прысутныя даклад настаўніцы А. Бараноўскай, выступленні слесара А. Хітрова, ткачыхі В. Дземянковай і інш.

На вечары былі прачытаны вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя дружбе, каханню.

Наш кар.

ГАСПАДАРЫ ДОМА КУЛЬТУРЫ

Чатыры месяцы назад працоўныя Чавус атрымалі выдатны падарунак: у цэнтры горада на ўскраіне Камсамольскага сквера ўрачыста быў адкрыты раённы Дом культуры з глядзельнай залай на 420 месц, пакоямі для работы гурткоў, прасторным фае.

Сюды мы прыйшлі пад вечар. У глядзельнай зале дэманструецца кінафільм для дзяцей. Паднімаемся на другі паверх.

— Ідуць заняткі гуртка крою і шыцця, — паведамляе дырэктар Дома культуры Піліп Казлоў.

У гуртку займаюцца 32 жанчыны. Імі кіруе Зоя Кулікіна. Тут спачатку вучацца шыць дзіцячае адзенне, а затым пяройдуць да больш складаных фасонаў. І хоць гурток працуе нядаўна, але па ўсяму відаць, што яго ўдзельніцы з поспехам дасягаюць пастаўленай мэты.

— І не толькі карысць у тым, — расказвае Зоя Кулікіна, — што мае вучаніцы навучацца самастойна шыць вопратку. Не менш важна для маладой маці — не замыкацца ў вузкіх рамках хатніх спраў, а быць у калектыве.

Мы яшчэ не закончылі гутарку з Зояй Кулікінай, як праз дзверы стала далятаць музыка. Гэта збіраўся на заняткі духавы аркестр. Як і заўсёды, першым прыйшоў яго кіраўнік— шафёр Леанід Асаў, а за ім — сувязіст Міхась Іваноў, слесар Уладзімір Хруцкі, шафёр Леанід Сасноўскі, рабочы райпрамкамбіната Леанід Гурынаў і інш.

Аркестр таксама малады. Яго ўдзельнікі пакуль што выконваюць марш і танцы. З будучага года мяркуюць развучыць класічныя творы рускіх і зарубежных кампазітараў.

Гурткі мастацкай самадзейнасці не першы год выступаюць з канцэртамі перад працоўнымі раёна. Сёння ў хоры занята 40 чалавек. Імі кіруе студэнт завочнага аддзялення Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі Сяргей Астапаў. Багаты і разнастайны рэпертуар калектыву. У яго праграме да двух дзесяткаў песень. Павагай у гледачоў карыстаецца вакальны квартэт у складзе работніцы гарсавета Таісы Кузюмінай, прадаўшчыцы магазіна Тамары Сіваковай, швачкі прамарцелі Любы Аўгустоўскай і работніцы РДК Маі Клюпінай. У праграме квартэта ў асноўным лірычныя і народныя песні. Ёсць у хоры і салісты. Напрыклад, кухарка сталовай Юлія Зяленская добра выконвае многія беларускія і рускія песні. А калі на сцэну выходзіць качагар Мікалай Данькоў і выконвае жартоўныя беларускія песні «Параска», «Гультайка», «Прыважала» і «Як ёй бог не памог»,— па зале пракатваецца дружны рогат і хваля апладысментаў.

Дзявочы танцавальны калектыў нядаўна на вечары мастацкай самадзейнасці, які адбыўся ў Доме культуры, добра выканаў «Беларускую польку», «Рускую кадрылю», малдаўскі танец «Юла» і іншыя народныя танцы.

У рэпертуары драматычнага калектыву — пераважна аднаактовыя п'есы. Гэта дазваляе яму больш аператыўна адгукацца са сцэны на падзеі жыцця ў раёне.

Пакуль мы знаёміліся з работай гурткоў, у глядзельнай зале ўжо было поўна народу. Праводзілася канферэнцыя чытачоў на тэму «За здаровы быт». Перад шматлікай аўдыторыяй выступілі ўрач мясцовай бальніцы Іван Ганчарык, дырэктар сярэдняй школы Іван Волкаў, настаўніца Зінаіда Баранава.

— У бліжэйшы час, — дзеліцца задумамі дырэктар РДК П. Казлоў,— мяркуем правесці вечар маладажонаў. Вопытны кухар-кулінар пакажа дзяўчатам як гатаваць смачныя стравы і сервіраваць стол, майстар-закройшчык прадэманструе прыгожыя ўзоры адзення, урачы і педагогі прачытаюць лекцыі пра выхаванне дзяцей. Планы на будучае мы складаем з удзелам шырокага актыву. Сапраўдныя ж гаспадары Дома культуры — працоўныя горада і раёна. А хто, як не яны, многае могуць падказаць нам у працы?!

М. АНЮКОЎ.

На здымку: раённы Дом культуры ў Чавусах.

Фота **А. Хілюка.**

На тэмы дня

Палепшыць дзейнасць мастацкіх саветаў

Абмеркаванне спектакля «Дабрадзеі» на сходзе ў Тэатры імя Янкі Купалы пры ўдзеле членаў мастацкага савета, драматургаў і крытыкаў, па сутнасці ператварылася ў дыскусію аб творчым шляху Акадэмічнага тэатра ў апошні перыяд. Вострыя і прынцыповасць спрэчак, якія толькі яшчэ пачаліся на гэтым сходзе, сведчаць пра тое, што ў жыцці мастацкага калектыву наспелі неадкладныя, важныя пытанні, і іх ужо нельга вырашыць без шырокай і шчырай размовы.

Нядаўняя сустрэча кампазітараў, лібрэтыстаў з членамі мастацкага савета Тэатра оперы і балету была таксама скарыстана для сур'ёзнай гутаркі аб сучасным рэпертуары і шляхах яго стварэння.

Нават гэтыя прыклады сведчаць аб тым, які вялікі маштаб дзейнасці мастацкіх саветаў тэатраў, наколькі важна іх аўтарытэтнае, патрабавальнае слова для творчага калектыву і для паглыблення яго сувязей з жыццём народа. Але можна пашкадаваць аб тым, што фактычная роля мастацкіх саветаў у паляпшэнні працы тэатраў пакуль што яшчэ менш значная, чым яна можа і павінна быць. Сістэматычны, актыўны ўдзел саветаў у вырашэнні многіх прынцыповых праблем развіцця тэатральнай культуры і творчасці кожнага тэатра асобку ўсё яшчэ не наладжаны.

Практыка дзейнасці мастацкага савета Тэатра імя Янкі Купалы паказвае, што ён не правіў належнай настойлівасці ў выпраўленні хібнай рэпертуарнай лініі калектыву, у паляпшэнні супрацоўніцтва з беларускімі драматургамі і скарыстанні рэалістычных нацыянальных мастацкіх традыцый.

Пры наяўнасці выдатнага ансамбля старэйшых майстроў, у тэатры яшчэ адчуваецца недахоп таленавітай моладзі, дастаткова падрыхтаванай, дастойнай заняць трывалае месца на сцэне Акадэмічнага тэатра.

Есць тут цікавыя, яркія індывідуальнасці, але аб іх поспехах і няўдачах на сходах мастацкага савета гаворыцца мала і не заўсёды на поўны голас.

Слаба працуюць мастацкія саветы абласных тэатраў. Яны яшчэ мала ўвагі аддаюць высокай якасці драматургіі, якая трапляе ў рэпертуар, удасканаленню рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства, дэкаратыўнага афармлення.

На старонках друку ў крытычных артыкулах, аглядах, рэцэнзіях і водгуках гледачоў часта робяцца сур'ёзныя заўвагі ў адрас тэатраў і асобных майстроў. Аднак гэтыя выступленні не выклікаюць адпаведнага рэагавання мастацкіх саветаў, не абмяркоўваюцца на іх сходах. Гэта наносіць шкоду і самому калектыву і справе выхавання маладых кадраў крытыкаў і тэатразнаўцаў.

Мастацкія саветы не могуць ставіцца абыякава і да таго, як асвятляецца аўтарамі гісторыя нацыянальнага тэатра, яны не павінны займаць у гэтых адносінах пазіцыю пасіўнага сузіральніка. Вядома, што гісторыя—не толькі старонкі слаўнага мінулага, але і традыцыі, якія маюць практычнае значэнне для сучаснікаў. Яны заслугоўваюць або творчага пераймання і далейшага развіцця або адхілення па тых ці іншых прычынах.

Праўдзівая, сапраўды навуковая, марксісцка-ленінская гісторыя тэатра дапамагае лепш арыентавацца і ў надзённых задачах драматургаў, тэатраў, рэжысёраў і акцёраў, спрыяе камуністычнаму выхаванню мастацкай моладзі.

У апошні час на кніжных паліцах з'явіліся салідныя працы, у якіх асвятляюцца многія істотныя з'явы гісторыі беларускага сцэнічнага мастацтва. Гэта кніга А. Бутакова аб Тэатры імя Янкі Купалы, даследаванні Ул. Няфёда, зборнік, прысвечаны тэатральна-дэкаратыўнаму мастацтву, манаграфіі аб акцёрах і іншыя.

Але кнігі, якім аддадзена многа часу і творчай энергіі, не сталі яшчэ тэмай для сур'ёзнай дыскусіі на сходах мастацкіх саветаў тэатраў і Міністэрства культуры БССР.

А каму, як не старэйшым членам саветаў — фактычным стваральнікам нацыянальных мастацкіх традыцый у паслякастрычніцкі перыяд — у першую чаргу меркаваць аб навуковым узроўні і прынцыповасці прац па гісторыі?

Пра тое, што такая размова патрэбна, сведчыць не толькі абмеркаванне «Дабрадзеяў». Пажаданні тэатразнаўцам і прэтэнзіі да іх выказваюцца амаль на ўсіх сходах і канферэнцыях, якія прысвечаны драматургіі, тэатру і тэатральнай крытыцы. Вялікі і вельмі каштоўны матэрыял дадуць будучым даследчыкам вынікі дыскусіі па гістарычных працах на сходах мастацкіх саветаў пры ўдзеле гледачоў.

Мастацкія саветы закліканы адыграць значную ролю ў творчым жыцці нацыянальнага тэатра. Іх актывізацыя — жыццёвая неабходнасць.

Калгасны ансамбль

Групамі і па адным з песнямі, жартамі і смехам ідуць калгасныя юнакі і дзяўчаты ў Яроменскі сельскі Дом культуры, ведаючы, што тут яны знойдуць для сябе заняткі па душы.

Вось маладая кукурузаводка Тамара Іваненка карыстаецца сярод сяброўак заслужанай павагай, як добрая працаўніца і лепшая ў калгасе выканаўца вясёлых прыпевак. А даярка Тамара Весялкова больш любіць мастацкае чытанне і, удзельнічаючы ў драмгуртку, марыць стварыць на сцэне вобраз сваёй сучасніцы...

Праўленне калгаса імя Сталіна вельмі дапамагло развіццю сваёй мастацкай самадзейнасці. Дякуючы гэтаму, на раённым агляндзе сельскія аматары мастацтва занялі другое месца і былі вылучаны абараняць гонар Гомельскага раёна на абласным агляндзе.

У гэтым калгасе пры непасрэднай падтрымцы старшыні М. Хаванскага нарадзіўся новы творчы калектыў—ансамбль песні і танца, здольны вырашаць больш складаныя пытанні мастацтва. Створаны напярэдадні снежаньскага Пленума ЦК КПСС, калгасны ансамбль аб'ядноўвае больш 80 калгаснікаў. Большая частка іх—гэта моладзь. Але і сталыя людзі не цураюцца самадзейнасці, актыўна ўдзельнічаюць у ёй.

Цяпер ансамбль старанна апрацоўвае нумары сваёй першай праграмы — літаратурна-музычнай кампазіцыі «Багаты і славуты наш калгас», якая напісана на матэрыялах мясцовага жыцця. Амаль усе вершы і мелодыі да песень створаны ўдзельнікамі самадзейнасці. Так, у складзенай сваімі сіламі песні аб Мінску харысты ўрачыста сцвярджаюць:

— І хай шчырая песня раскажа
Пра цудоўны і радасны час,
Што ў жыццё ў заможнае наша
Шлях трымае наш родны
калгас...

Стварэнне гэтага своеасаблівага ансамбля — сведчанне яшчэ большага росквіту самадзейнага мастацтва слаўных працаўнікоў аднаго з перадавых калгасаў Гомельшчыны.

Ф. КУРАС.

На сцэне — бацька і дачка

З вялікім задавальненнем слухаюць члены сельгасарцелі «Чырвоны Кастрычнік», што на Лепельшчыне, ігру сваіх аднавяскоўцаў Івана Мікалаевіча Мішуты і яго дачкі Паліны — аматараў ігры на цымбалах і баяне. На вечарах мастацкай самадзейнасці, якія адбываюцца ў калгасным клубе, часта выступаюць бацька і дачка. Асабліва добра выконваюць яны беларускія народныя танцы «Лявоніху», «Крыжачок», «Бульбу». У сям'і калгасніка расце яшчэ адзін музыкант — малодшая дачка Марыя. Яна захапляецца ігрой на баяне.

Д. ЗАРЭЦКІ.

У бібліятэцы Мінскага тонкасуконнага камбіната больш 17 тысяч кніг палітычнай, мастацкай і тэхнічнай літаратуры. Амаль усе рабочыя і служачыя з'яўляюцца чытачамі бібліятэкі.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца выстаўкі кніг па тэкстыльнай вытворчасці. Нядаўна тут афармлены стэнд: «У дапамогу брыгадам камуністычнай працы», дзе выстаўлены навінкі навуковай і мастацкай літаратуры.

На здымку: чытачы бібліятэкі знаёмяцца з літаратурай.

Фота **С. Чырэшкіна.**

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Мы не за цяплічныя ўмовы

У Гродна шмат маладых літаратараў. Але абласное літаратурнае аб'яднанне не надае ім чамусьці належнай увагі. Раней яны збіраліся адзін або два разы ў год, а цяпер зусім няма ніякай работы з пачынаючымі літаратарамі. Мы, студэнты, маладыя паэты з педагагічнага, а таксама сельскагаспадарчага і медыцынскага інстытутаў, пішам вершы для насценных газет, чытаем іх на вечарах, спрачаемся паміж сабой — і на гэтым усё канчаецца. Былы старшыня літаратурнага аб'яднання А. Карпюк выехаў з Гродна ў Маскву. Літаб'яднаннем пачаў кіраваць Я. Яўсцігнееў. Але пакуль што зроблена вельмі мала: хіба толькі тое, што ў калідоры рэдакцыі «Гродзенскай праўды» вывесілі план работы.

Абурае нас стаўленне да выдання ў педагагічным інстытуце літаратурнага зборніка. Выданне зборніка было запланавана яшчэ да 40-й гадавіны БССР. Падрыхтавалі вершы, здымкі, завезлі ў Мінск на рэдагаванне, прывезлі назад. Здавалася б, даўно можна было яго надрукаваць, але зборнік да гэтага часу не выйшаў. Падчас друкуюцца ў нас у газеце «Гродзенская праўда» літаратурныя старонкі. Вось нумар газеты ад 29 лістапада.

Вершы, надрукаваныя тут, агульныя, дэкларацыйныя. У іх няма свежых вобразаў, вельмі мала паэзіі. Чым, напрыклад, могуць усхваляваць чытача такія радкі з верша Я. Яўсцігнеева «Занеманская сторона»:

А сегодня? Только посмотрите —
Как и в центре, эта сторона,
Равная участница событий —
Перемен **внушительных** полна,

Вот они, подарки! Их немало!
Трубами коснулись облаков
Целые проспекты и кварталы
Заново построенных домов.

А вось як апісвае заваяванне касмічнай прасторы Пятроўскі ў вершы «Русь, ты — Родина моя»:

Светит в космосе ракета,
Мирно с солнцем говоря...
Это русская планета —
Новой эры свет-заря.

Не лепшы верш і Шуценкі «Мое спасибо»:

Хотя не часто в Гродно
приезжаю,
Он каждый раз становится
родней,
Когда пальто днём хмурым
надеваю,
Я вспоминаю гродненских ткачей.

И тех, кто шьет из хрома
полботинки,
В которых я гуляю по весне,
Кто издает газету **без заминки,**
Чтоб знали мы о новостях
в стране.

И свет настольной лампы
помогает
По вечерам о будущем мечтать.
Рабочий гродненский **пусть знает:**
Ему спасибо **я хочу** сказать.

Штучны і вельмі слабы ў мастацкіх адносінах верш І. Юшчанкі «Урожайное». Тут, што ні радок, то дзяжурныя, збітыя штампы: «ветерок ленивый», «корабли-комбайны», «мать-земля».

М. Дуброўскага таксама пахваліць няма за што (гл. верш «Сябрам з Казлоўшчыны»):

Вось, дарэчы, Томчык Галя:
Як даярка ўвесь раён
І ўся вобласць наша хваліць
За яе работы плён.

І Марыя Ермаловіч
З кожным днём вядзе спарней
Справу, дадзеную ў слове
Па вырошчванню свіней.

Не толькі мы, але і самі гераіні гэтага верша згодзяцца з намі, што гэта вельмі халодная паэзія.

Кожны літаратурны твор, змешчаны ў абласным ці рэспубліканскім друку, павінен быць яркім, услаўляць нашу сучаснасць з вялікай мастацкай сілай.

Мы не патрабуем «цяплічных умоў» для сябе, але ж такі стан спраў у нашым абласным літаб'яднанні і такое стаўленне да маладых, як у Гродзенскай вобласці, прымушаюць нас сказаць сваё адкрытае слова.

Алесь КАЛІНА,
Казімір КОЙТА,
Уладзімір ШУРПА
і інш.

У ЗЕМЛЯКОЎ

Беларускія пісьменнікі, якія нарадзіліся і жылі на Уздзеншчыне часта наведваюць землякоў. У раённым Доме культуры, сельскіх клубах часта адбываюцца сустрэчы калгаснікаў з пісьменнікамі. Днямі ў раённы Дом культуры прыехалі А. Астрэйка, А. Бялевіч, І. Гурскі, А. Пальчэўскі. Аб развіцці беларускай савецкай літаратуры расказаў прысутным А. Бялевіч. Пісьменнікі чыталі свае творы, дзяліліся творчымі планамі.

У гэты ж дзень пісьменнікі наведалі рэдакцыю раённай газеты «Калгаснік Уздзеншчыны» і дапамаглі ў стварэнні літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі.

Пра подзвіг пісьменніка

На паўночны захад ад пасёлка Бякетаўка Сталінградскай вобласці знаходзіцца вышыня з адзнакай 95,9. Тут у 1942 г. быў пахаваны малодшы лейтэнант Шынклер—пісьменнік і воін, які загінуў смерцю героя ля сцен Сталінграда.

Жыццё і творчасць Хвядоса Сяргеевіча Шынклера, аднаго з таленавітых прадстаўнікоў беларускай савецкай літаратуры, былі цалкам прысвечаны барацьбе народа за пабудову новага сацыялістычнага свету. Ён заўсёды быў на пярэднім краі гэтай барацьбы. І калі надыйшоў час цяжкіх выпрабаванняў, ён добравахотна, па закліку сэрца пайшоў туды, дзе вырашаўся лёс Радзімы, каб са зброяй у руках абараняць тое, што і ўслаўляў у сваіх творах. Талент Хв. Шынклера не паспеў праявіцца ў поўную меру, але і тое, што ён зрабіў, з'яўляецца значным укладам у беларускую савецкую літаратуру. У Хв. Шынклера была зайздросная адданасць сваёй роднай рабочай тэме: ён добра ведаў чыгунку і любіў яе людзей—рабочых, тэхнікаў, інжынераў, жыццё і стваральную працу якіх глыбока адлюстраваў у сваіх творах. Творчасць Ув. Шынклера займае ў беларускай савецкай літаратуры значнае месца не толькі таму, што ён быў у ліку піянераў беларускай літаратуры, якая глыбока адлюстравала вялікія пераўтварэнні эпохі першых савецкіх пяцігодак — незабыўнага часу рэвалюцыйнай рамантыкі, працоўнага гераізму, але і таму, што ўсю сваю творчасць прысвяціў рабочаму класу рэспублікі, у прыватнасці, чыгуначнікам, таму, што яго аповесць «Сонца пад шпалы» з'явілася адным з самых першых буйных твораў беларускай савецкай літаратуры, прысвечаных вытворчай тэме.

Ужо даўно наспела неабходнасць навуковага даследавання жыцця і творчасці пісьменніка. Аднак да апошняга часу, як гэта ні дзіўна, нашы крытыкі і літаратуразнаўцы чамусьці абыходзілі жыццёвы і творчы шлях гэтага таленавітага мастака слова, абмяжоўваліся асобнымі артыкуламі, рэцэнзіямі або прадмовай да кнігі. Праўда, вылучаецца грунтоўнасцю, на наш погляд, цікавы, напісаны ў крытыка-публіцыстычным плане, артыкул Я. Герцовіча «Пясняр рабочых будняў». Але гэта было, на жаль, амаль усё, што мы мелі пра творчую спадчыну Хв. Шынклера. Вось чаму з асаблівай цікавасцю чытаеш выдадзеную нядаўна Дзяржаўным выдавецтвам БССР манаграфію Л. Арабей «Хвядос Шынклер».

Гэта, па сутнасці, першая ў нашым літаратуразнаўстве спроба зрабіць усебаковы разгляд жыцця і творчасці пісьменніка.

Творчы шлях Хв. Шынклера, як вядома, прыпадае галоўным чынам на трыццатыя гады. Гэты перыяд у гісторыі савецкай беларускай літаратуры яшчэ далёка не вывучаны нашымі крытыкамі і літаратуразнаўцамі. Даследуючы творчасць Хв. Шынклера, аўтар манаграфіі пэўным чынам папаўняе гэты прабел у нашым літаратуразнаўстве. Кнігу Л. Арабей вылучае шчырая павага да пісьменніка-грамадзяніна. У ёй сабраны багаты фактычны матэрыял, прааналізаваны не толькі найбольш значныя творы пісьменніка, але і самыя яго вершы, яшчэ ў многім недасканалыя спаўданні. Для манаграфіі характэрна прадуманасць меркаванняў аб творчасці Шынклера і аб агульным літаратурным руху 20—30-х гадоў. Яснасць аўтарскай думкі спалучаецца ў ёй з прастатой і даступнасцю выказвання. Аўтар манаграфіі правільна робіць, разглядаючы творчасць Хв. Шынклера на фоне велічных сацыялістычных пераўтварэнняў, што адбываліся ў нашай краіне. У кнізе верна характарызуецца барацьба перадавых беларускіх савецкіх пісьменнікаў з фармалізмам у тагачаснай літаратуры, а таксама паказана як рэалізаваліся ў творчасці беларускіх літаратараў ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі і метад сацыялістычнага рэалізма. Пераканальна гаворыць аўтар і пра ўплыў Горкага, горкаўскіх традыцый на творчасць Хв. Шынклера. Вельмі каштоўна, што Л. Арабей выразна, з канкрэтнай пераканальнасцю, паказвае, што вызначальным фактарам творчага развіцця пісьменніка з'яўляліся яго партыйнасць, адданасць ідэалам свайго часу, што давала яму магчымасць разгледзець у жыцці галоўнае, істотнае, новае. Такім чынам, можна сказаць, што аўтар манаграфіі ў асноўным здолеў выканаць складаную задачу. Чытач атрымаў цікавую і патрэбную кнігу. Але, станоўча ацэньваючы першую кнігу пра Хв. Шынклера, нельга не спыніцца і на значных яе недахопах.

У жанры крытыка-біяграфічнага нарыса важна разглядаць творчы метад пісьменніка ў адзінстве з яго грамадзянскай біяграфіяй. Аўтар кнігі, безумоўна, імкнуўся не адрываць творчасць Хв. Шынклера ад яго жыццёвага шляху. Але, на жаль, біяграфічная частка даследавання атрымалася сухая і схематычная, аўтар абмяжоўваецца толькі рэгістрацыяй асноўных дат жыцця і творчасці пісьменніка.

Кніга складаецца з трох раздзелаў: «Пачатак шляху», «У нагу з жыццём», «Пісьменнік, воін, грамадзянін». Такая пабудова манаграфіі зусім даравамерная. Але, пакладзшы ў аснову кнігі храналагічны прынцып асвятлення творчасці пісьменніка, аўтар сутыкнуўся з другой цяжкасцю жанра. Аналізуючы мастацкія прынцыпы пісьменніка, яго дасягненні ў тыпізацыі характараў і абставін, пошукі новых літаратурных форм, аўтар манаграфіі аказаўся звязаны храналагічным ізлажэннем матэрыялу. А гэта прывяло да перагружанасці некаторых раздзелаў. Калі, напрыклад, першым апавяданнем адведзена трыццаць старонак, дык апавяданням, напісаным у 1938—1939 гг., усяго толькі дзве. Вельмі збяднёным выглядае аналіз драмы «Пачэсны рэйс». Мы ўжо не гаворым пра тое, што за рамкамі манаграфіі засталіся чамусьці крытычныя і літаратуразнаўчыя работы Хв. Шынклера.

У кнізе Л. Арабей няма спецыяльнага раздзела аб асаблівасцях мастацкага майстэрства пісьменніка. Мастацкі аналіз аўтар імкнецца даць у адзінстве з разглядам ідэй і зместу твораў. Але нельга сказаць, што гэтая спроба зусім удалася Л. Арабей. Аўтар больш разважае аб тым, што адлюстроўвае пісьменнік, чым як ён гэта робіць. Асаблівую ўвагу аўтар кнігі звяртае на характарыстыку асобных вобразаў, на выкарыстанне пісьменнікам дэталей, малюе знешні партрэт герояў, іншы раз пейзаж, але амаль зусім нічога не гаворыць пра сюжэт і кампазіцыю твораў. У гэтым сэнсе не пашанцавала нават і аповесці «Сонца пад шпалы», якой адведзена найбольшая колькасць старонак і дадзены больш-менш падрабязны ідэйна-мастацкі аналіз. Аўтар таксама падрабязна характарызуе асобныя вобразы аповесці, іх эвалюцыю, але яны не разглядаюцца ў непарыўнай сувязі з развіццём дзеяння. Карацей кажучы, аўтар упарта абыходзіць кампазіцыйную і сюжэтную структуру аповесці. Між тым, гэта дапамагло б яму найлепшым чынам раскрыць ідэйную задуму твора і асаблівасці яе мастацкага ўвасаблення.

Недахопам манаграфіі з'яўляецца недастатковая ўвага яе аўтара да адной вельмі адказнай тэмы, якая праходзіць амаль праз усю творчасць Хвядоса Шынклера. Гутарка ідзе аб палітычна важнай тэме класавай барацьбы, бальшавіцкай пільнасці. Знаходзячыся заўсёды ў гушчыні падзей, пісьменнік добра ўсведамляў, якую небяспеку ўяўляюць сабой ворагі сацыялізма, што шалёна супраціўляліся ўсім мерапрыемствам Савецкай улады. І таму ва ўсіх сваіх творах ён бязлітасна выкрываў носьбітаў варожай ідэалогіі.

Нельга згадзіцца з думкай Л. Арабей, што, напрыклад, у аповесці «Сонца пад шпалы» ворагі Савецкай краіны, інжынеры Стэрвінс, Булыга, Стройбалаў паказаны вельмі ўжо бездапаможнымі. Справа, вядома, не ў тым, што адзін з іх — Стройбалаў — захапляецца курамі-плымутрокамі і трусамі пароды «шыншыла», а другі — Булыга — непапраўны гурман. Усё гэта было даволі характэрна для прадстаўнікоў старой царскай інтэлігенцыі. Галоўнае ў тым (і на гэтым пісьменнік засяроджвае ўвагу чытача), што ўсе гэтыя стройбалы і стэрвінгі былі глыбока замаскаваныя ворагі ўлады Саветаў. Іменна ў гэты час (у пачатку 1928 г.) была раскрыта буйная шкодніцкая арганізацыя буржуазных спецыялістаў у шахцінскім і іншых раёнах Данбаса («шахцінская справа») і нездарма. калі было выкрыта шкодніцтва на электрастанцыі, рабочыя кваліфікуюць гэта як яўнае «шахцінства», а ўдзельнікаў падрыхтоўкі выбуху называюць не інакш як «шахцінцы». Аўтар манаграфіі сцвярджае, што вораг паказаны ў аповесці прымітыўным, што такіх, як Стройбалаў, можна было вельмі лёгка разгадаць і выкрыць. Але паслухайце, што кажа адзін з герояў твора — сакратар партарганізацыі Хорд: «Біць нас трэба! — асіплым спішаным голасам праказаў Хорд: — Дбайнасці класавай не хапіла... На нас адказнасць перад партыяй, перад краінай... Згубілі пільнасць, захапіліся веліччу планаў, а яны — от! Яны не спяць... Гг-гады...» Гэтыя словы партыйнага кіраўніка як мага лепш пацвярджаюць становішча, што стварылася тады на асобных участках сацыялістычнага будаўніцтва, якое ў «Гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза» ахарактарызавана наступным чынам: «Шахцінская справа» сведчыла аб прытупленні рэвалюцыйнай пільнасці ў гаспадарнікаў-камуністаў да буржуазных спецыялістаў, аб дрэннай рабоце масавых рабочых арганізацый Данбаса, перш за ўсё прафсаюзаў, якія не прыслухоўваліся да скаргаў шахцёраў, не развівалі крытыку знізу, якая паскорыла б выкрыццё шкоднікаў».

Такім чынам, у аповесці «Сонца пад шпалы» Хв. Шынклер пераканаўча паказаў усю цяжкасць і складанасць пэўнага перыяду класавай барацьбы ў краіне, у выніку якой, нарэшце, было зломлена супраціўленне кулацтва і шкоднікаў у прамысловасці.

У нашай крытыцы дагэтуль не існуе адзінай думкі аб жанравым характары такіх вядомых твораў Хв. Шынклера, як «Запіскі інструктара Томана» і «Пульс жыцця (запіскі тэлеграфіста)». Аўтар манаграфіі лічыць, што «Запіскі інструктара Томана» па сваім жанры не аповесць, а хутчэй нарыс або запіскі. На думку Я. Казекі, гэты твор трэба лічыць, наадварот, аповесцю. Цікава, між іншым, адзначыць, што Л. Арабей праз некалькі старонак (стар. 114), забыўшыся, мабыць на сваё першае сцвярджэнне, таксама называе «Запіскі інструктара Томана»... аповесцю. М. Лобан сцвярджае, што «Пульс жыцця (запіскі тэлеграфіста)» — высокамастацкі нарыс, а Л. Арабей не згаджаецца з гэтым, настойваючы на тым, што гэты твор, безумоўна, аповесць.

Нам здаецца, што паважаныя таварышы стукаюцца ў адчыненыя дзверы таму, што абодва гэтыя творы Хв. Шынклера з'яўляюцца па свайму жанру аповесцямі, напісанымі ў форме запісак.

У манаграфіі прысутнічаюць элементы гістарызма. Аўтар спрабуе гістарычна падыйсці да з'яў літаратуры наогул і творчасці Шынклера ў прыватнасці. Храналагічна разглядаючы яго прозу, Л. Арабей імкнецца суаднесці яе з жыццём, што дазваляе крытыку правільна вызначыць яе галоўную «рабочую» тэму. Але гісторыя не дзеяць ў яе сувязі з сучаснасцю. Адсутнасць публіцыстычнасці, якая, як вядома, складае адну з характэрных асаблівасцей нашай літаратурнай крытыкі, не дазволіла, на жаль, аўтару захаваць вострае пачуццё сучаснасці пры размове аб падзеях учарашняга і сённяшняга дня беларускай савецкай літаратуры.

Аўтар манаграфіі, даносячы да чытача галоўнае ў творчасці Хв. Шынклера, імкнецца паказаць яго творчы шлях, так сказаць, на «паляпшаючыя» гісторыю. Яшчэ ў пачатку кнігі адзначаецца, што ў творчых пошуках пісьменніка будуць няўдачы і памылкі. Нельга сказаць, што аўтар абыходзіць маўчаннем недахопы ў творах Шынклера, але ў далейшым вядзецца вельмі невыразная размова пра гэтыя недахопы, тым больш няўдачы і памылкі. Будучы з аднаго боку вельмі стрыманым у ацэнцы творчасці пісьменніка, аўтар манаграфіі, з другога боку, нешта саромеецца больш канкрэтна і падрабязна гаварыць і пра недахопы твораў, і пра тыя цяжкасці, якія перадолваў на сваім творчым шляху пісьменнік. Нават значныя недахопы першых апавяданняў аўтар спяшаецца апраўдаць тым, што гэтыя недахопы былі характэрны для многіх маладых беларускіх празаікаў.

Сустракаюцца ў кнізе і памылкі прынцыповага характару. Неабгрунтавана, напрыклад, сцвярджэнне Л. Арабей аб тым, што ў палітычнай лірыцы Багдановіча прысутнічалі элементы... сацыялістычнага рэалізма.

Такім чынам, вопыт манаграфічнага даследавання Л. Арабей у радзе выпадкаў аказаўся ніжэй задумы кнігі. Аднак адзначаныя вышэй недахопы не закрэсліваюць зусім відавочнага факта: Л. Арабей напісала ў многім цікавую і, галоўнае, патрэбную кнігу.

Хвядос Шынклер загінуў у цяжкім 1942 г., калі вырашаўся лёс Савецкай краіны. Але гарачы патрыёт сваёй Радзімы, ён ні хвіліну не сумняваўся ў будучай перамозе, дзеля якой аддаў сваё мужнае і высакароднае жыццё пісьменніка і грамадзяніна.

У няспынным руху Савецкай краіны, у стваральнай працы народа п[illegible] цягнае прымаць актыўны ўдзе[illegible] мі творамі выдатны беларускі [illegible] менік Хвядос Шынклер.

Ул. ЛАУРО[illegible]

Шчыра, ад душы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.).

Антось Гарбоўскі смяецца.

—Дык ты ж і прыёмнік можаш круціць ды шукаць добрых перадач?

— А ты думаеш, я не кручу! Дык бачыш, батарэй тых не дакупішся. Зайдзі ў магазін, дык іх усё няма. Слаба гаворыць мой прыёмнік, не хапае батарэй. А каб электрыка!.. Уключыў і загрыміць. Добра ў мястэчку або ў вёсцы, а ў нас гэтыя чортавыя хутары. Да кожнай хаты слупы стаў.

Прыемна слухаць такую гаворку. Былы хутаранін, моцны гаспадар, якому ўласны хутар калісьці быў даражэй за ўсё, які зубамі трымаўся за свой кавалак зямлі, цяпер праклінае хутары, бо яны яго не пускаюць да светлага культурнага жыцця. Ён ведае сімфоніі і санаты, можа, не разумее іх, але хіба ў гэтым справа! Справа ў тым, наколькі вырасла калгаснае сялянства, якія духоўныя патрабаванні яно прад'яўляе.

А Сцяпан Гараліч між тым прадаўжае:

— Скарэй бы гэтыя хутары сцягвалі, а то тырчаць яны на нашых палях, як паразіты якія. Не такая гата дробязная справа, трэба, каб і ў Маскве гэтым зацікавіліся. Бо што адно слова варта: хутар. Мой бацька дык ажаніўся з хутарам, а не з маткай. Прымак ён. Маткі не любіў. Калатнеча была ў хаце, не давядзі бог. Абы звядуцца з маткай, то яна яго абавязкова папракне: «А ты голы! Басяк! Тут твайго нічога няма! Хутар мой! Ідзі вон!» Не рады быў ён таму хутару.

Тут наша гаворка набывае іншы напрамак, бо да нас далучаецца яшчэ адзін дзядзька. Мне ён не знаёмы.

— Гэта брыгадзір нашай брыгады,—тлумачыць мне Сцяпан Гараліч.—Я от раскажу табе пра яго, і ты тады зразумееш, як мы цяпер жыць пачалі. Не бойся, Вінцась, я праўду раскажу,—звяртаецца ён да брыгадзіра.

Той усміхаецца.

— Расказвай. Я ведаю, пра што ты раскажаш. Як я на курорт ездзіў.

— Ну і вядома... Дык слухай. Вінцась брыгадзірствуе ў нас шэсць гадоў. Месяцаў некалькі назад ён захварэў. І цяжка захварэў. Трэба лячыцца. Паляжаў ён у бальніцы, папраўіўся, але ўрачы яму раяць у санаторый з'ездзіць месяцы на два. А сродкаў чалавек не мае, каб пуцёўку набыць. Наш старшыня і кажа яму: «Пачакай крыху, Вінцась. Купім табе пуцёўку за калгасны кошт. Зарабіў ты яе». А тут, як гром з яснага неба: перавыбары... Нашага старшыню забіраюць, а нам другога. Ну што ж, выбралі мы яго. Вінцась і галаву павесіў. «Ну,—кажа,— прапала мая пуцёўка. Новы старшыня мяне не ведае, а я, брыгадзірам будучы, можа, каму не дагадзіў... Нагавораць старшыні сем кашалёў, не дасць пуцёўкі». Ці не так, Вінцась?

— Так! Я ўжо і не думаў.

— Ну от бачыш! І я не думаў. Новаму старшыні абавязкова нагавораць, бо такія людзі ёсць. Абы новае начальства, то яны яго і пасуць: «А той такі, а той гэтакі, а ты таму не вер, а таго не слухай». Шэльмы гэта, а не людзі. Жулікі. І калі старшыня чалавек не самастойны, характару не мае, то абмарочаць. А я думаю: ці не прыдзецца нам змагацца з новым старшынём за старога брыгадзіра! Дык што ты думаеш? Не прышлося. Даў пуцёўку! Самую лепшую, за тры тысячы рублёў! Аж на два месяцы. І пабыў наш Вінцась у Крыме. Тыдзень мінуў, як дадому вярнуўся.

— Я, Сцяпан, на Каўказе быў.

— Няхай на Каўказе. Але ж цяпер здаровы?

— Нібы і не хварэў ніколі.

Вінцасю яўна хочацца расказаць нам пра свае ўражанні аб Каўказе, але ініцыятыву захапіў Сцяпан і аддаваць яе не хоча.

— Крым, Каўказ,—кажа ён, — не ў іх справа... Мне хочацца, каб было нейкае рашэнне аб калгасных старшынях. Каб, скажам, выбіраць старшыню не менш чым на тры або пяць гадоў. Бо гаспадарку за год не ўзнімеш. Яе за год толькі пасадзіць можна. А хіба не відаць, як чалавек пачынае гаспадарыць? Першы год ён толькі нацэльваецца. Тут і зразумець можна, куды ён цягне. Калі бярэ дрэнны прыцэл, тады мяняць. А то бывае, што не дадуць чалавеку і разгарнуцца як след. От і наш стары старшыня... І чалавек быў і гаспадар. Не хацелі мы яго аддаваць. Ды, мабыць, і ён без вялікай ахвоты ад нас пайшоў. Я выступіў на сходзе і кажу: «Што гэта робіцца? Узбіліся мы на добрага гаспадара, а вы яго ад нас забіраеце. У нас,—кажу, — тыя, што ў Мінск з калгаса паўцякалі, ужо дамоў вярнуліся. Што гэта значыць? Гэта значыць, што мы жыць пачалі. Мы не ездзім у горад па хлеб. Да нас людзі пачалі прыязджаць, не толькі ў заработкі, а на пастаянна, жыць! А ад нас старшыню забіраюць...» Дык бачыш, недзе ёсць няўдалы калгас, то туды трэба паслаць добрага гаспадара, каб узняць яго. От і пашлюць нашага старшыню...

— У вас жа і новы старшыня нядрэнны,—кажу я.

— Гэтага мы яшчэ не ведаем. Мала ён у нас.

— Хто яго ведае,—кажа Вінцась. —Мне дык пра яго і гаварыць дрэнна не выпадае... Аж ж ён, браце Сцяпан,—тут Вінцась звярнуўся да Гараліча,—не аддаў Лявону сена.

— Не аддаў?—перапытвае Гараліч і хмыкае.

— Якога сена?—пытаюся я.

— Воз сена,—адказвае Вінцась.— Лявон цалае лета на жнярцы працаваў, не злазіў з яе, можна сказаць. Карову мае, а сена не накасіў. Ці дзіва! Ён не толькі нашу брыгаду абслужыў, а і суседнія дзве. Спецыяліст, можна сказаць. Стары старшыня абяцаў яму воз сена, а новы не даў. «Можа стары старшыня абяцаў вам усё сена аддаць,—кажа,—адкуль я ведаю. Не так многа ў нас сена, каб па возу яго раздаваць».

Гараліч маўчыць.

— Сена гэтае...—прадаўжае Вінцась.—Тут таксама нейкае рашэнне трэба. Кароў трымаем, а кармоў на іх не хапае. У каго мацнейшая сям'я, дык з лесу ды з дарог нажосяць, а як у таго Лявона дзеці малыя, то яму як? Хоць карову збывай, а без яе цяжка...

Тут ажывіўся Сцяпан Гараліч.

— Да гэтага не дойдзе, каб Лявон карову збыў,—кажа ён.—Паможа калгас каровы вытрымаць. Але справа, браткі, да таго ідзе, што мы самі скора кароў сваіх калгасу аддадзім. Само жыццё паказвае дарогу. От яшчэ год, два, і не выгадна будзе калгаснику трымаць карову. Навошта патрэбна будзе карова табе або мне, калі цябе калгас усім забяспечыць. А мы да таго ідзём. Тут, браце, само жыццё рашэнне вынясе!

Радашковіцкі раён.

Літаратурныя нататкі

НОВЫЯ ТВОРЫ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

«Пяе наша радасць» — вакальны зборнік твораў беларускіх прафесіянальных і самадзейных кампазітараў. У яго ўвайшлі сем сольных і харавых песень, прэміяваных на рэспубліканскім конкурсе да 40-годдзя Беларускай ССР. Тэматыка песень — наша сучаснасць. Многія з іх прысвечаны Беларусі, яе людзям і прыродзе, шчаслівому жыццю. Лірыка заўсёды была найбольш прыкметнай у творчасці беларускіх кампазітараў, і нездарма рад песень зборніка развіваюць гэтую тэматыку. Сярод песень лірычнага характару вылучаецца «Зорка» М. Аладава, прыгожая вакальная мініятура, пранізаная інтанацыямі беларускай народнай песеннасці. Цікавыя песні Ю. Семянякі, Р. Пукета, Г. Ударава і інш.

□

«Танцавальная сюіта» М. Аладава — партытура для вялікага сімфанічнага аркестра. У творы дзве часткі: «Цярэшка» і «Віхурны танец»,

У гэтым годзе ў калгасах і саўгасах Брэсцкай вобласці створана 213 новых калектываў мастацкай самадзейнасці. У іх удзельнічае больш «рох тысяч калгаснікаў, рабочых і служачых.

На здымку: хор калгаса «Прагрэс» Гарадзішчанскага раёна.

Фота А. Перахода. БЕЛТА.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ФАЛЬКЛОР БРЭСТЧЫНЫ

Мара беларускага народа аб'яднанні Беларусі ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве знайшла шырокае адлюстраванне ў народнай музычна-паэтычнай творчасці. У час белапанскага рэжыму песня была верным спадарожнікам рэвалюцыйнага пралетарыята, магутным сродкам палітычнай агітацыі сярод працоўных мас. Апрача агульнавядомых песень рускага рэвалюцыйнага



подполля народ заходніх абласцей Беларусі ствараў свае песні, якія былі водгукам на розныя рэвалюцыйныя падзеі таго часу. У асяроддзі беларускіх рэвалюцыянераў нараджаліся смелыя песенныя творы, якія ўзнімалі вызваленчы дух простых людзей, аб'ядноўвалі іх сілы ў барацьбе супраць прыгнятальнікаў, усялялі ўпэўненасць у перамогу. Гэтыя творы былі пра вялікіх правадыроў міжнароднага рабочага руху і пра народных барацьбітоў-рэвалюцыянераў.

Так у свой час на Кобрыншчыне бытавала «Песня аб Леніне». Яе спявалі на палітычных мясоўках і ў турмах. Яна была прысвечана трагічнай падзеі ў жыцці сусветнага пралетарыята—смерці Уладзіміра Ільіча Леніна. Песня мае мелодыю маршавага характару, а тэкст яе расказвае аб мільёнах людскіх галасоў, якія зліліся ў адзіным рэвалюцыйным парыве.

«Песня аб Леніне»—гэта заклік да згуртавання працоўных вакол Камуністычнай партыі. Аўтары гэтага твора засталіся невядомымі. Мелодыя і тэкст былі запісаны ад былой падпольшчыцы, цяпер персанальнай пенсіянеркі О. Русак, якая жыве ў Кобрыне. У сваю чаргу старая рэвалюцыянерка ўпершыню пачула «Песню аб Леніне» ў Сандамірскай турме з вуснаў настаўніцы з Варшавы (на жаль, яе прозвішча невядома). О. Русак успамінае, якое вялікае ўражанне рабіла на зняволеных гэтая песня, калі яе спявалі ў турэмнай камеры на тры галасы некалькі чалавек.



Не менш папулярнай была песня «Аб трох камунарах», створаная ў саракавых гадах. У ёй расказваецца аб трох мужных рэвалюцыянерах-падпольшчыках, якіх схапіла польская ахранка і па-зверску закатавала.

Песня аб трох камунарах запісана таксама ад былой падпольшчыцы В. Селівонік, якая зараз жыве ў Брэсце. Па характару яна блізкая да старажытных рускіх лірычных песень.

З гутаркі са старым камуністам, жыхаром вёскі Радванічы Брэсцкага раёна Ф. Чарэўкам мы даведаліся, што ў гэтай мясцовасці ў канцы трыццатых гадоў шырокае распаўсюджанне атрымала песня «Чырвоны Сцяг». Яна мае ўрачысты патрыятычны характар, і выконвалася часцей за ўсё ва ўрачыстыя для падпольшчыкаў дні. У песні «Чырвоны Сцяг» вельмі адчуваецца ўплыў польскага музычнага фальклору. І гэта зусім заканамерна, бо рэвалюцыйны рух польскага пралетарыята і нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускіх працоўных мелі паміж сабой цесную сувязь. Беларусы і палякі разам змагаліся супраць памешчыкаў і капіталістаў, за лепшую долю.

Рэвалюцыйная песня жыла і за сценамі турмы, за драцяной агарожай. З такіх песень вядома «Слухай, хлопчык...», якая нарадзілася ў асяроддзі палітзняволеных і потым пранікла на волю з-за турэмных кратаў. Яна прысвечана Парыжскай Камуне, яе барацьбітам, якія загінулі ля сцен могілак Пэр-Ляшэз.

Паводле сведчання дырэктара школы вёскі Калядзічы Пружанскага раёна С. Барадоўскага, песня выконвалася ў Пружанскай турме ў 1932—1935 гг. Гэтая ж мелодыя, але ўжо з другім тэкстам, распаўсюдзілася сярод палітзняволеных канцлагера Картуз-Бяроза, дзе знаходзіўся і жыхар горада Кобрына П. Сядзюк, цяпер персанальны пенсіянер.

Песні, поўныя гераізму і смеласці, ствараліся не толькі па турмах, але і тымі людзьмі, якія былі на волі і вялі падпольную работу. Песня «Паўстань жа, Брэстчына!» або «Наперад, Брэстчына!» (запісана ад работніка Брэсцкага ГК КПБ т. Ласковіча) з'явілася водгукам на падзеі, звязаныя з Лепялеўскім паўстаннем 1933 г. і шматлікімі рэвалюцыйнымі выступленнямі народных мас Брэста. Гэтую песню, як успамінае Ласковіч, можна было пачуць і ў полі ад жней і нават на вячорках.

Колькі сілы і энергіі надавалі рэвалюцыйныя песні адважным сынам і дочкам беларускага народа ў іх барацьбе! З песнямі яны ішлі на масавыя дэманстрацыі, на выкананне даручэнняў падпольных партыйных і камсамольскіх камітэтаў, з песнямі стойка пераносілі ўвесь цяжар доўгіх пакутлівых гадоў турэмнага зняволення. Створаныя ва ўмовах бяспраўнага капіталістычнага рэжыму, гэтыя песні дыхалі верай у перамогу і клікалі да свабоды, да шчасця і святла.

В. ПАУЛАВА,
студэнтка гісторыка-тэарэтычнага факультэта Белдзяржкансерваторыі.

У рабочым інтэрнаце

У мінулую нядзелю з самай раніцы ў інтэрнаце рабочай моладзі буд-трэста № 4 рабочыя з хваляваннем чакалі запрошаных гасцей—беларускіх пісьменнікаў.

А дваццатай гадзіне прыйшлі празаікі Піліп Пестрак, Янка Скрыган, Тарас Хадкевіч, Іван Мележ, Уладзімір Шахавец і паэт Станіслаў Шушкевіч.

У чырвоным кутку людна. Першым выступіў Піліп Пестрак. Ен гаварыў аб цяжкай ганаровай працы пісьменніка. Затым ён прачытаў апавяданне «Гудок гудзе», якое было выслухана рабочымі з вялікай увагай.

Амаль усе рабочыя прачыталі апавяданне Янкі Скрыгана «Наталля». Яно ўсім вельмі спадабалася. Па просьбе прысутных Янка Скрыган расказаў, як ён працаваў над гэтым творам.

Перад рабочымі выступіў аўтар вядомага рамана «Мінскі напрамак» Іван Мележ. Вельмі зацікавілі прысутных вершы паэта Станіслава Шушкевіча.

Уладзімір Шахавец, расказаўшы пра шлях сваёй аповесці «Месца ў жыцці», прачытаў цікавы ўрывак. Тарас Хадкевіч расказаў моладзі аб рамане «Даль палявая».

Весела і цікава праходзіла сустрэча, арганізаваная масавай бібліятэкай Кастрычніцкага раёна г. Мінска, а, галоўнае — яна яшчэ больш зблізіла чытачоў з пісьменнікамі, паглыбіла веды моладзі аб цудоўнай беларускай літаратуры, садзейнічала лепшай прапагандзе кніг.

Э. КАРНІЛОВІЧ,
сакратар камітэта камсамола будтрэста № 4.

ДЭКАДА СЯБРОЎ КНІГІ

У Брэсце адкрылася дэкада сяброў кнігі, арганізаваная абласным упраўленнем культуры сумесна з гарадскім камітэтам камсамола. Памяшканне драматычнага Тэатра імя ЛКСМБ запоўнілі рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя. У госці да брэстчан прыехалі беларускія пісьменнікі І. Мележ, М. Хведаровіч, А. Бажко, І. Салавей. Вечар, прысвечаны дэкадзе, адкрыў начальнік абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук.

Крытык і перакладчык Л. Салавей выступіў з дакладам аб беларускай літаратуры.

Іван Мележ расказаў прысутным аб асаблівасцях творчага працэсу, аб складанасці працы пісьменніка, падрабязна спыніўся на тым, як ён працаваў над вобразам генерала Чарняхоўскага ў рамане «Мінскі напрамак».

А. Бажко прачытаў урывак з вершаванай аповесці «Карвіга пакідае хутар». З сваімі вершамі слухачоў пазнаёміў М. Хведаровіч.

На вечары выступілі таксама члены літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце «Зара» — маладыя паэты І. Мельнічук, Ул. Хоміч, Л. Дашук.

Лепшы грамадскі распаўсюджвальнік кніг з Іванаўскага раёна В. Ляўчук падзяліўся вопытам работы, расказаў аб тым, як ён распаўсюджвае літаратуру сярод насельніцтва.

У фае драмтэатра быў арганізаваны продаж кніг беларускіх пісьменнікаў.

Братава слова

Смольня... Так называецца месца непадалёку ад вёскі Мікалаеўшчыны Стаўбцоўскага раёна. Тут жыве і працуе ў калгасе брат вялікага беларускага песняра Юзік Міхайлавіч Міцкевіч. Гэта самы малодшы брат паэта, у якога ён шмат гадоў назад хаваўся ад царскіх жандараў пасля нелегальнага з'езду настаўнікаў. Юзік Міхайлавіч падтрымліваў матэрыяльна свайго вялікага брата ў цяжкія для яго часы вымушанага беспрацоўя. Малодшы брат Коласа з юначых год і дасюль захапляецца яго творчасцю. Многія творы ён ведае напамяць і часта выступае з чытаннем перад калгаснікамі. Нядаўна ён паспяхова выступіў на раённым агляде мастацкай самадзейнасці ў Стаўбцоўскім раённым Доме культуры. Юзік Міхайлавіч выканаў са сцэны раздзел з паэмы «Новая зямля». Ю. М. Міцкевіч вылучаны для ўдзелу ў мінскім абласным агляде мастацкай самадзейнасці.

А. СЛЕСАРЭНКА.

Неабходныя папраўкі

Творчасць Міхася Чарота — выдатная з'ява ў гісторыі беларускай савецкай літаратуры. Арганічна звязаная з важнымі праблемамі свайго часу, яна была актуальнай і надзённай у глыбокім сэнсе гэтых слоў. У яркіх паэтычных вобразах М. Чарот адлюстраваў сучасную яму рэчаіснасць, думы і адчуванні народных мас, іх гарачае імкненне і рашучасць перабудаваць жыццё на новых, камуністычных асновах. Ён узбагаціў беларускую паэзію новымі тэмамі і вобразамі, новым светаадчуваннем. Таму яго творчасць не страціла свайго ідэйна-эстэтычнага значэння і для нашага часу. Гэтым тлумачыцца зацікаўленасць, з якой сустрэў чытач выхад у свет двухтомніка выбраных твораў вядомага паэта.

Перад укладальнікам і рэдактарам стаяла вельмі адказная задача — выбраць са спадчыны паэта ўсё найбольш сталае, паэтычна спелае, што з магчымай паўнатой адлюстроўвае творчы шлях і паэтычную індывідуальнасць паэта і разам з тым не страціла свайго значэння для нашага часу.

Мы не будзем гаварыць, у якой ступені ўкладальнік вырашыў гэтую задачу, бо мэта нашага артыкула іншая. Заўважым толькі, што ў першы том не ўвайшлі некаторыя творы, якія, на нашу думку, абавязкова трэба было ўключыць (вершы «Буралом», «На шляху адраджэння», «Вечная бура», «А я іду», «Новы Алімп», драматычны абразок «Сон на балоце», паэма «Карчма» і інш.).

Укладальнік якога б там ні было зборніка павінен даць дакладныя тэксты. А для гэтага ён павінен не проста перадрукаваць іх з таго ці іншага выдання, але зверыць кожны тэкст з усімі папярэднімі выданнямі, уключаючы і першае надрукаванне.

На жаль, укладальнік першага тома не выканаў гэтых патрабаванняў. Ён, узяўшы за аснову трохтомнік першага збору твораў М. Чарота (выданне 1933 г.), перадрукаваў паэтычныя тэксты з першага і другога тома, не зверыўшы і не вычытаўшы іх як след. Праўда, у заўвагах да першага тома ўкладальнік піша, што «вершы звяраліся па іншых выданнях». Сярод гэтых выданняў названы зборнік «Выбраныя вершы і паэмы» (Школьная серыя), які складзены на аснове першых двух тамоў збору твораў выдання 1933 г. Гэтага яўна недастаткова для сур'ёзнай падрыхтоўкі тэкстаў выдання. Укладальнік павінен быў абавязкова зверыць тэксты з першадрукам—з газетнымі, часопіснымі тэкстамі. Яму не цяжка было зрабіць гэта пры наяўнасці больш-менш дакладнай бібліяграфіі, якая робіцца ў заўвагах.

Аднак ён стаў на больш лёгкі шлях і цалкам даверыўся першаму збору твораў паэта. А даверыцца гэтаму выданню якраз і нельга, бо яно дэфектнае. Не кажучы аб памылках друку, у першым томе першага збору твораў ёсць грубыя скажэнні тэкстаў, дапушчаныя па недагляду рэдактара. Аб некаторых такіх скажэннях патрэбна расказаць тут, бо яны паўтораны ў новым выданні.

Той, хто быў знаёмы з М. Чаротам, ведае, што ён не вельмі ўважліва адносіўся да сваёй літаратурнай спадчыны. У выніку такой бесклапотнасці мы пазбаўлены тэксту цудоўнай рамантычна-музычнай драмы «На Купалле». Абнародаваўшы яе праз тэатр, аўтар на гэтым заспакоіўся і не надрукаваў тэксту. Так здарылася і з радам іншых яго паэтычных твораў, у тым ліку з паэмай «Асінград», якую паэт у асноўным скончыў у 1927 г., са сцэнарыем «Агні на балоце», напісаным у 1930 г. і інш.

У 1931 г. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі прапанавала М. Чароту падрыхтаваць збор сваіх твораў. Паэт пачаў збіраць, перш за ўсё, тыя творы, якія ўжо былі надрукаваны ў газетах, часопісах, у асобных зборніках. Ён не перадрукоўваў тэксты, а выразаў іх з кніг, газет, часопісаў і здаваў у выдавецтва. Некаторыя творы ён здаў па аднаму экземпляру і не наклеенымі на асобныя аркушы паперы, як гэта патрабавала выдавецтва. У такім выглядзе былі здадзены ў выдавецтва творы «Восень сыпле пажоўклыя лісці», «Суровы прыгавор падпісваю першым...», а магчыма і інш.

Верш «Восень сыпле пажоўклыя лісці» ўвайшоў у першы том збору твораў пад назвай «Буду верыць» (выданне 1933 г., стар. 198—199). Упершыню ён быў надрукаваны ў часопісе «Полымя» (жнівень-верасень, 1929, стар. 39—40). На старонцы 39 набрана восем строф (32 радкі), на старонцы 40—сем строф (28 радкоў) і дата «14-X-29».

У выніку няўважлівасці асобных работнікаў выдавецтва 28 радкоў гэтага верша не трапілі ў першы том, а потым і ў апошняе выданне.

Вось гэтыя радкі. Яны павінны ісці следам за восьмай страфой (стар. 167 выдання 1958 г.).

Вас палохае подых варожы,
Што імкнецца знішчаць нашу
працу...
Край савецкі ўвесь свет
пераможа,—
Буду пець яму гімн і змагацца.

Восень сыпле пажоўклыя лісці
На зямлю, што ў творчым уздыме...
Не палохайся, сябра мой, выйсці,
Усё назваць у жыцці сваім імем.

Можна пець пра каханне і здраду,
Пра вясёласць жыцця і сумоту,
Толькі ў песні дазнацца мы рады—
Для каго ты спяваеш і хто ты?

А бывае, што слухаеш песню,
Не згадаць: дзе там радасць, дзе
гора,
Што паэту на свеце жыць цесна,—
Ну, а гэтым—твой цешыцца вораг.

Буду верыць—жыццё ўсім дакажа,
Што астатняга ворага зможам...
І я песняй, як злотнаю пражай,
Сусвет вольны тады упрыгожу.

Ну, а вас, хто пяе безнадзейна,
Ісці з намі пакінула сіла,
Вось такіх не патрэбна людзей
нам, —
Хай гарбатых спраўляе магіла.

Восень сыпле пажоўклыя лісці
На зямлю, што ў змаганні і працы...
Не шукаю іншага выйсця—
Буду жыць і спяваць і змагацца!
14.X-29 г.

Вядомы верш «Суровы прыгавор падпісваю першым...», напісаны 5 кастрычніка 1930 г., быў надрукаваны ў двух часопісах—«Полымя» (кніга адзінаццатая—дванаццатая, 1930, стар. 3—5) і «Маладняк» (№ 12, 1930, стар. 10—12). У «Полымі» тэкст надрукаваны без адбіўкі строф, у «Маладняку» адбіты чатырохрадковыя строфы. У вершы 24 страфы (96 радкоў).

У выдавецтва М. Чарот перадаў іменна выразкі з часопіса «Маладняк» і таксама ў адным экземпляры. Мабыць, работнік выдавецтва заклеіў канец верша «Буду верыць», узяў і наклеіў на асобны аркуш паперы старонку 11, заклеіўшы старонку 12, на якой надрукаваны канец верша «Суровы прыгавор...». Такім чынам было заклеена некалькі радкоў, якія выпалі з верша.

Характэрна, што ніхто з работнікаў выдавецтва не звярнуў увагі на тое, што верш не мае канца, што старонка 11 тэксту з «Маладняка» канчаецца паўстрафой:

Наш смелы крок—узвышша
затраслося,
Законы піша дыктатура працы,

што няма лагічнага завяршэння страфы, што дадзены тэкст (стар. 11) канчаецца не кропкай, а коскай. Карэктар, заўважыўшы толькі коску, паставіў кропку. І ўсё.

Укладальнік першага тома твораў Н. С. Перкін таксама не ўчытаўся ў тэкст і не звярнуў увагі на незвычайнае з'явішча, калі строга вытрыманыя чатырохрадковыя строфы раптам абрываюцца на двух радках. Ён механічна перанёс дэфектны тэкст першага збору твораў і не ўключыў 26 радкоў верша.

Адновім гэтыя радкі. Яны ідуць следам за цытаванымі двума радкамі:

Кулацтва дзікае ў роспачы
галосіць,
Дык на каго ж цяпер вам
апірацца?

Свае мы шэрагі яшчэ мацней
узброім,
Як клясу знішчым вашу мы
апору...
Не жыць вам больш махлярствам
і манюю,
Зладзейскі загавор чыніць на нас
у норах.

Мы поўны сіл жывых і творчага
запалу,
Камуны радасная будуючы
айчызну...
Варожую зруйнуем мы навалу
Магутным поступам сацыялізму.

Заводы, фабрыкі, святло
электрастанцый
Змагацца й будаваць нам
наддаюць натхненне...
А ну, папробуйце вы супраць нас
паўстанне,
Няшчасных выродкаў ліхое
пакаленне!

Не знішчыць нас, нас не зламаць,
не здушаць,
Якой бы сілаю на нас ні рушыў
вораг,—
За нас, працоўных, свет—вось
нашае аружжа,
Нас не палохае, што пахне дым
і порах.

Зямля савецкая агнём адплаты
дыша.
Яна цвісці і красавацца хоча...
Над вамі, здраднікі, цяжкі прысуд
надпіша
Уладар зямлі—мільёны рук
рабочых.

О, ганьба вам! Пішу вам пакаранне
І шлю праклён сваёю думай-
вершам...
Суровы прыгавор, каб знішчыць
вас дазвання,
Над вамі я падпісваю першым.
5.X-30 г.

Заўважым, што ў школьных чытанках 30-х гадоў верш «Суровы прыгавор...» надрукаваны цалкам, а вось у «Выбраных вершах і паэмах» (Школьная серыя) ён надрукаваны без канца.

На жаль, на гэтым не канчаюцца дэфекты выдання 1958 г. Яно не толькі паўтарае памылкі выдання 1933 года, але ўносіць і свае ўласныя. Так, напрыклад, у вершы «Жывое балота» пераблытаны радкі сёмай страфы. Там надрукавана:

Збудуем палац да нябёс...
Мы створым жыццё невіданае,
Там будзе ўсім брацтва чаканае,
Не будзе там здзеку і слёз.
(стар. 84)

У аўтара гэтая страфа мае такі выгляд:

Мы створым жыццё невіданае,
Збудуем палац да нябёс...
Там будзе ўсім брацтва чаканае,
Не будзе там здзеку і слёз.

Неапраўданымі з'яўляюцца тыя купюры, якія зрабіў укладальнік з уступа да паэмы «Ленін». Паэт пытае:

Ці хутка загасне
Узняты
Вайной непатрэбнай
Вялікі пажар?
Ці хутка
Дні хмурыя
Зменяцца яснымі?
А людзі
У новым паходзе—
За волю—
Рашучае скажуць:
— Даволі!
(стар. 235—236, выд. 1958).

Зусім ясна, што паэт гаворыць аб імперыялістычнай вайне. Аднак ён не становіцца на пацыфісцкія пазіцыі адмаўлення ўсякай вайны, не абмяжоўваецца толькі воклічам «Даволі!». За цытаванымі радкамі ідуць радкі, якія выкраслілі укладчык:

— Мы за новыя войны!
Ахвяр не прыносім
Больш
Дарма!

«Мы за новыя войны!»—гэта на мове таго часу—мы за рэвалюцыю, г. зн. за войны супраць эксплуататараў, якія развязваюць імперыялістычныя войны, мы за грамадзянскія войны (новыя войны)! «Ператварэнне сучаснай імперыялістычнай вайны ў грамадзянскую вайну ёсць адзіна правільны пралетарскі лозунг...» (Ул. І. Ленін, «Вайна і расійская сацыял-дэмакратыя»), «Рэвалюцыя ў час вайны ёсць грамадзянская вайна...», пісаў Ул. І. Ленін. («Аб паражэнні свайго ўрада ў імперыялістычнай вайне»).

Ніхто з нашых сучаснікаў не зразумее паэта так, што ён быццам агітуе за войны, у той час, калі мы супраць іх вядзём барацьбу. Дык навошта было выкрэсліваць цытаваныя радкі?

Неапраўдана выкраслілі укладчык і радкі:

З паходу
У паход кліча
Скіфіі дзікай
Новы прарок...
Хоча ён
Зямлі аяскравіць аблічча,
Што вякамі ў змроку.,

якія ідуць следам за цытаванымі раней радкамі. Укладчыку, мабыць, не да густу прыйшліся радкі паэта «Скіфіі дзікай» і «Новы прарок».

Зусім зразумела, што радок «Скіфіі дзікай» гучыць іранічна, а не сцвярджальна. Нізрынутыя эксплуататары і іх ідэолагі называлі нас «дзікунамі», «варварамі» і іншымі абразлівымі тэрмінамі. М. Чарот як бы згаджаецца з гэтымі тэрмінамі, але на справе развенчвае іх, сцвярджаючы сусветна-гістарычнае культурнае значэнне нашай рэвалюцыі:

Хоча ён
Зямлі аяскравіць аблічча,
Што вякамі ў змроку.

Радок «Новы прарок» таксама не змяшчае ў сабе нічога такога, каб лічыць яго недапушчальным. Папершае, гэты сімвал ужываецца даволі часта ў паэзіі таго часу, нават у дачыненні да Леніна, па-другое, словы «прарок», «прароцтва» не абавязкова звязаны з рэлігійным светаўспрыйманнем. Слова «прароцтва» ўжываў і Ул. І. Ленін.

У паэме «Беларусь лапцюжная», раздзел 13, страфа сёмая, радок чацвёрты, у выданні 1933 года была дапушчана памылка, якая скажае сэнс радка. Замест «Хто морыць дух мінулых дзён атрутай» надрукавана «Хто марыць дух мінулых дзён атрутай». Гэтая памылка механічна перанесена і ў выданне 1958 года (гл. стар. 261).

Ёсць у гэтым выданні і недарэчныя, мабыць карэктарскія, праўкі. Як вядома, у 20 і 30-я гады слова клас пісалася ў жаночым родзе «кляса», Мінск пісаўся Менск, паэт —паэта і г. д. Перадрукоўваючы творы М. Чарота, нехта паспрабаваў правіць тэксты ў адпаведнасці з сучасным напісаннем гэтых слоў. Адсюль такія недарэчнасці: замест «Вялікіх заваёў рабочай клясы» ў выданні 1958 г. надрукавана «Вялікіх заваёў рабочага класа» (стар. 171). Нехта дадаў лішні склад да чаротаўскага радка і рытм радка змяніўся, страфа разбурылася.

Пару слоў аб крыніцах першадруку. Яны складзены даволі поўна, але і ў іх ёсць недакладнасці і прыкрыя памылкі друку. На старонцы 291 Н. С. Перкін сцвярджае, што верш «Да моладзі» ўпершыню змешчаны ў зборніку «Завіруха». На справе ж ён пад назвай «Да працоўнай моладзі» надрукаваны ў газеце «Савецкая Беларусь», № 19 (29), 5.IX.20. Подпіс—М. Кудзелька.

Можна было б прывесці яшчэ шэраг недакладнасцей і памылак, дапушчаных укладальнікам, але нам здаецца, што досыць і пададзеных прыкладаў, каб зрабіць вывад: нельга так нядбайна ставіцца да падрыхтоўкі выдання паэтычнай спадчыны.

Л. БЭНДЭ.

ПАНІКА

Лойд ДЭВІС

Аўтар апавядання — прагрэсіўны аўстралійскі пісьменнік, які друкуецца ў вядомым часопісе «Овэрлэнд» («Па ўсёй краіне»).

У пятніцу, калі гэта здарылася, я цэлы дзень прабыў у судзе і нічога не ведаў пра чуткі, што распаўзліся па горадзе. Праўда, на вочы мне трапіў загаловак вячэрняй газеты: «Ля Пёрта разбіўся атамны бамбардзіроўшчык», і я прачытаў мнагаслоўны і блытаны артыкул аб нейкім чатырохсапловым рэактыўным самалёце Каралеўскіх ваенна-паветраных сіл, які, «відавочна, прымаў удзел у чарговых выпрабаваннях» і разбіўся на досвітку ў раёне зараснікаў на поўнач ад горада.

У артыкуле ўпаміналася пра «строгі ваенны кардон». Пэўна таму больш падрабязнасцей не давалі.

Памятаю, у суботу мяне крыху здзівіла, што ў ранішняй газеце гэтай падзеі адводзілася менш чатырох дзюймаў калонкі на трэцяй паласе. Але цяпер ужо гэта была толькі «вымушаная пасадка ля Пёрта», а «ваенны кардон» ператварыўся ў «ачапленне».

Разам з суботнімі пакупкамі мая жонка прынесла з кірмашу розныя няпэўныя чуткі, з якіх мы толькі пасмяяліся («Нібы на ім была вадародная бомба», «Кажуць, яна ўзарвалася»).

Пасля полудня да нас завітаў сусед Досан, які займаў адказную пасаду на грамадзянскай службе. Да яго таксама дайшлі нейкія чуткі. І ён хацеў хоць што кольвек даведацца ад нейкага авіяцыйнага начальніка, але той гаварыў з ім вельмі асцярожна.

Усё яшчэ не даючы веры чуткам, я паспрабаваў пазваніць некаторым высокім асобам — камісару паліцыі, сяму-таму з суседзяў, мясцоваму члену парламента. Аднак дазваніцца было вельмі цяжка — цяжэй, чым у самую напружаную гадзіну пятніцы: усе тэлефоны былі заняты. Ад няспыннага енку сігнала «занята» ў сэрца закралася першае адчуванне страху.

Я праклінаў тэлефонны дыск за яго марудлівасць і ў нецярпенні тыцкаў пальцамі ў адтуліны дыска, але ў адказ чуў адно і тое ж механічнае выццё, ад якога можна было ашалець.

Нарэшце, я ўсё ж дазваніўся да аднаго знаёмага. Ад яго слоў валасы сталі дыбам.

Старэйшы яго сын, які служыў у авіяцыі, удзельнічаў у вучэбных палётах Аўстралійскіх каралеўскіх ваенна-паветраных сіл на аэрадроме ў Пірсе. У пятніцу ўдзень усім ваеннаслужачым нечакана адмянілі нядзельныя звальненні. Аднак большасць хлопцаў на змярканні пайшла ў самаволку, каб папярэдзіць бацькоў.

Нехта са старшых афіцэраў заярнуўся да іх з прамовай, панура сказаўшы: «Вось як яно, хлопцы» і «Памром на сваіх пастах». Не прайшла непрыкметнай і выдача пастаяннаму персаналу і яго сем[illegible] колькасці карычневай «антырадыя[illegible]».

Ж[illegible] пра неадкладны ад'езд на фер[illegible] то жыла на паўднёвым захад[illegible]

Я [illegible] вялікім дурнем, каб проста так узяць свае чамаданы і кінуць усё з-за нейкіх неправераных чутак. Яна ледзь не кінулася ў істэрыку і ўсё прыгаварвала:

— Калі табе хочацца, каб нашых дзетак разарвала на кавалкі, дык я не хачу!

Але тут мы ўспомнілі, што двое нашых хлопчыкаў пайшлі на футбол, а да іх вяртання, вядома, нельга было ад'язджаць.

Урэшце жонка згадзілася падзяжурыць каля прыёмніка, пакуль мы з Досанам абыйдзем бліжэйшых суседзяў, каб што-небудзь пэўнае пачуць ад іх.

Нашы пошукі інфармацыі неўзабаве ператварыліся ў ваенны савет. Па меры таго, як кожны дадаваў сваю долю чутак, карціна рабілася ўсё больш і больш пахмурай. А калі мы стаялі на вуліцы ля майго дома, раптам аднекуль з поўначы пачуўся гул — паказаліся два страі рэактыўных самалётаў, за якімі ляцела некалькі звычайных. Яны павярнулі на ўсход і рушылі ў глыб мацерыка.

— Уцякаюць! — крыкнуў Досан, калі мы ўсе, не адрываючы вачэй, глядзелі ў той бок, дзе яны зніклі.

Быў яшчэ чуцен іх гул, як раптам з хаты выбегла жонка: а пятай гадзіне па радыё выступіць прэм'ер-міністр!

Раптоўна з другога канца вуліцы пачуліся жахлівыя крыкі:

— Та-та! Ма-ма! — да нас з плачам беглі нашы перапалоханыя хлопчыкі. Балельшчыкі, напэўна, стыхійна пакінулі трыбуны, не дачакаўшыся канца гульні: сярод іх з маланкавай хуткасцю распаўсюдзіліся жахлівыя чуткі. Дзеці страшэнна перапалохаліся. У гэтым мітуслівым натоўпе ім, пэўна, крутавата давялося, і яны ледзь дабраліся дадому.

А палове пятай у нас сабралася многа суседзяў: мы выпрацоўвалі планы магчымай эвакуацыі. Гаспадары аўтамашын згадзіліся даць месца тым, у каго машын не было. Для стварэння надзвычайнага грашовага фонду некалькі чалавек, у якіх быў рахунак у банку, добраахвотна прапанавалі размяняць чэкі ў бліжэйшай гасцініцы і атрыманыя грошы пазычыць астатнім.

К таму часу, як дыктар абвясціў, што са спецыяльным зваротам да насельніцтва штата Заходняя Аўстралія па радыё выступае прэм'ер-міністр, атмасфера моцна наэлектрызавалася.

Спачатку прэм'ер-міністр сказаў, што няма падстаў кідацца ў паніку і што яму вельмі хацелася б пабыць разам з намі, каб падзяліць нашу трывогу і рассеяць усе нашы страхі. Потым расказаў, як у брытанскім самалёце тыпу «Вэльянт», які прымаў удзел у чарговых выпрабаваннях, сапсаваўся рухавік, калі самалёт з вадароднай бомбай ляцеў у раён выпрабаванняў.

«... відавочна, непасрэдны начальнік, на якога раптам лягла адказнасць за выратаванне каштоўнага чалавечага жыцця і загадаў лётчыку сесці на бліжэйшым аэрадроме, а іменна — на вашым вельмі добрым лётным полі ў Пірсе.

На няшчасце лётчык пры пасадцы прамінуў аэрадром, зрабіў гераічную спробу набраць вышыню і накіраваць самалёт у бок мора. Але яму гэта не ўдалося, і я павінен вам з вялікім болем паведаміць, што самалёт разбіўся ў лясістай мясцовасці, якраз на поўнач ад вашага горада, а храбры афіцэр і яго экіпаж загінулі.

Цяпер я падыходжу да пытання, якое, напэўна, больш за ўсё вас цікавіць: якая існуе небяспека выбуху бомбы, што ўпала разам з бамбардзіроўшчыкам? Я ўпэўнена адказваю: вельмі нязначная. Амаль ніякая. Па гэтай справе ваш урад атрымаў самыя кваліфікаваныя заключэнні экспертаў. Бомба, безумоўна, забяспечана засцерагальнікамі, і калі яна не ўзарвалася пры ўдары аб зямлю, то разумна дапусціць, што практычна яна зусім няшкодная».

Далей прэм'ер-міністр запэўніў нас, што ён будзе падтрымліваць няспынную сувязь з экспертамі, і ў выпадку якіх-небудзь змен у сітуацыі нам неадкладна паведамяць.

Калі ён скончыў, мы ўсе лягчэй уздыхнулі. Пачалася ажыўленая гаворка.

— Ну, цяпер, пэўна, можна і падсілкавацца!— усклікнуў адзін з тых, хто добраахвотна хацеў пазычыць нам грошы, памахваючы ў паветры пачкам запэцканых банкнотаў, якія ён вымяняў для нас у гасцініцы. Лёгкі румянец на яго шчоках сведчыў, што сур'ёзнасць абстаноўкі не перашкодзіла яму падзаправіцца, калі ён хадзіў у атэль.

Мы вырашылі, што на ўсялякі выпадак нядрэнна рэзерваваць грошы, і я атрымаў паўнамоцтвы на складанне неабходных даўговых распісак. Недагаворанасць, якая адчувалася ў прамове прэм'ер-міністра, нас з жонкай трохі непакоіла, магчыма, трохі больш за астатніх — з прычыны нашых палітычных поглядаў.

Нядзельная газета яшчэ больш памножыла нашы трывогі. Яе загалоўкі, набраныя надзвычай буйным шрыфтам, заклікалі прэм'ер-міністра і наогул улады «даць нам факты». Ішоў цэлы шэраг завуаляваных сцвярджэнняў і рытарычных пытанняў, якія намякалі на тое, што нам сказалі не ўсю праўду, што над паўночнымі ўскраінамі горада навісла сур'ёзная пагроза і што ўпотай вядзецца паспешная падрыхтоўка да эвакуацыі.

Апоўдні я паехаў да шашы, каб заправіць бен-

(Заканчэнне на 4-й стар.)

У памяшканні Палаца культуры прафсаюзаў на сцэне гарадскога Народнага тэатра выступіў драматычны калектыў Беларускага палітэхнічнага інстытута імя І. В. Сталіна. Ен паказаў п'есу Я. Шварца «Аповесць аб маладых супругах». Пастаноўка і афармленне Ус. Кухты. Рэжысёр спектакля Л. Чыжэўская.

На здымку: сцэна са спектакля. У ролях: Марусі Арловай — **Г. Вусціна**, Сяржы Арлова — **Я. Канавалаў.**

Фота Ул. Крука.

АКТЫЎНЫ ДЗЕЯЧ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

(Да 100-годдзя з дня нараджэння М. А. Янчука)

Дзейнасць Мікалая Андрэевіча Янчука была шырокая і разнастайная. Яго ведаюць як этнографа, літаратуразнаўцу, паэта, музыканта, драматурга — і ўсюды ён пакінуў прыкметны след. Гэта быў таленавіты, адукаваны і вельмі сціплы чалавек.

Нарадзіўся М. Янчук 17 лістапада (ст. ст.) 1859 г. у вёсцы Корніцы Бельскага павету Холмскай губерні. Дзяцінства яго было звычайным дзяцінствам вясковага хлопчыка — з пастуховай пугай. Бацькі былі ўніятамі, аднак маці вельмі хацела, каб яе Мікола стаў ксяндзом. Яго не аддавалі вучыцца ў «свецкую» школу. Толькі пасля смерці маці бацька аддаў 11-гадовага хлопчыка ў гімназію ў горад Бельск. М. Янчук марыў стаць урачом, але пад уплывам аднаго з выкладчыкаў змяніў намер і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Там слухаў лекцыі такіх вядомых вучоных, як Ф. Буслаеў, В. Ключэўскі, Н. Ціханраваў.

Пасля заканчэння ў 1885 г. універсітэта па прапанове Н. Ціханравава Янчук застаецца пры ўніверсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання.

У Маскве Мікалай Андрэевіч працаваў выкладчыкам рускай мовы ў розных гімназіях, хатнім настаўнікам у сям'і камісара па сялянскіх справах Е. М. Гарднера. Неўзабаве пасля паспяховай здачы магістарскага экзамена ён пачынае працаваць у Румянцаўскім музеі, спачатку памочнікам бібліятэкара, а пасля—хавальнікам Дашкаўскага этнаграфічнага музея і аддзялення замежнай этнаграфіі.

М. Янчук добра ведаў Беларусь, Украіну. Яго этнаграфічныя інтарэсы абмяжоўваліся пераважна гэтымі мясцінамі. У апошнія гады жыцця ён працаваў амаль выключна для развіцця навукі і культуры ў Беларусі.

У 1901 г. у Маскве ўзнікла музычна-этнаграфічная камісія, мэтай якой было збіранне музыкі народаў Расіі. Душою гэтай камісіі і галоўным дзеячом стаў Янчук. Ён арганізоўваў музычна-этнаграфічныя вечары і падрыхтаваў два музычныя зборнікі для школы — беларускі і ўкраінскі.

Жывучы ў Маскве, Мікалай Андрэевіч трымаў сувязь з беларускімі зямляцтвамі ўніверсітэта і сельскагаспадарчай акадэміі. Шчырая дружба звязвала яго з Янкам Купалам. Янчук заўсёды імкнуўся дапамагчы ў справе культурнага адраджэння беларускага народа. З яго дапамогай у 90-я гады мінулага стагоддзя студэнты-беларусы выдалі ў Маскве на беларускай мове апавяданне Гаршына «Сігнал».

М. Янчук добра ведаў, што такое цэнзура, бо сам быў драматургам. Яго п'есы, напісаныя на ўкраінскай мове, — «На чужыне» («Шчарбатая доля»), «Па ярмарку» — былі забаронены цэнзурай за тое, што паказвалі быт простых людзей, гаварылі аб нацыянальнай незалежнасці Украіны. Іншыя п'есы М. Янчука, якія ўбачылі святло рампы, карысталіся ў свой час даволі вялікай папулярнасцю. Асабліва гэта датычыць п'есы «Піліп-музыка», якая трымалася на сцэне з 1887 да 1922 г.

Па сведчанню Назара Бываеўскага, Янчук пісаў творы і на беларускай мове пад псеўданімам Мікула Грымот. З яго спадчыны вядомы два невялікія вершы і апавяданне «Пад ядловец», надрукаваны ў каталіцкай газеце «Беларус». І зусім нядаўна ўдалося адшукаць яго п'есу «Блуднікі», забароненую царскай цэнзурай у 1912 г.



М. А. Янчук.
(Здымак друкуецца ўпершыню).

П'еса была прадстаўлена ў цэнзуру Янкам Купалам. У ёй расказваецца пра вясковую дзяўчыну Анэту, якую спакусіў сын пана Янук, і пра яе брата — рабочага Юзюка. Пакуты дзяўчыны, што з-за разбэшчанасці паноў пападае ў публічны дом, пераклікаюцца са становішчам яе брата, выкінутага з фабрыкі пасля няшчаснага выпадку. Сацыяльная завостранасць, тэндэнцыйнасць п'есы прывялі да таго, што цэнзар прапанаваў «не дазволіць п'есу да прадстаўлення, якая нацкоўвае адно саслоўе на другое, тым больш, што яна, як напісаная беларускай гаворкай, разлічана на гледачоў-сялян».

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі М. Янчук аддае ўсе сілы справе развіцця культуры і навукі на Беларусі. Ён актыўна працуе ў камісіі па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У 1918 г. М. Янчук чытае курс беларускай літаратуры і этнаграфіі ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве. На аснове гэтых курсаў ён выдаў пасля кнігу «Этнаграфічны нарыс Беларусі» і «Нарыс беларускай літаратуры». Такім чынам, ён быў першым, хто стварыў падручнік па гісторыі беларускай літаратуры.

Пасля адкрыцця ў Мінску Дзяржаўнага ўніверсітэта М. Янчук быў зацверджаны прафесарам па кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі. Ён пачаў ужо чытаць курс лекцый, але, вяртаючыся з Мінска ў Маскву, захварэў на тыфус і 6 снежня 1921 г. памёр.

Навуковыя працы і літаратурная спадчына М. Янчука, якая заставалася невядомай да апошняга часу, сведчаць пра своеасаблівы талент вядомага дзеяча беларускай культуры.

А. САННІКАЎ.

У Магілёўскім педагагічным

ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧЫ ГУРТОК

Цікава і разнастайна праходзяць заняткі літаратурна-творчага гуртка пры Магілёўскім педагагічным інстытуце, якім кіруе кандыдат філалагічных навук А. Макарэвіч. За два апошнія гады гурток правёў абмеркаванне аповесці П. Шасцерыкова «Камень за камнем», зборніка вершаў «Дзень нараджэння» С. Грахоўскага, раманаў Ул. Карпава «За годам год» і «Вясенняя ліўні» з удзелам саміх аўтараў; у гасцях у гурткоўцаў былі вядомыя беларускія пісьменнікі П. Броўка, М. Лынькоў, К. Крапіва, П. Глебка, І. Мележ і прафесар І. Гутараў.

У апошнія гады значна актывізавалася творчая група гуртка: маладыя паэты і празаікі выпусцілі некалькі нумароў газеты «Маладыя галасы», рыхтуецца да друку першы друкаваны зборнік твораў літаратараў інстытута. Каля 20 аўтараў будзе прадстаўлена ў гэтым зборніку.

Трэба адзначыць, што абласное літаб'яднанне не аказвае ніякай дапамогі гуртку пры педінстытуце.

НА СТУДЭНЦКАЙ СЦЭНЕ

За час свайго існавання драматычны гурток, бадай, ніколі не быў такім шматлікім, як сёлета. Побач з аднаактовымі п'есамі студэнты паставілі на сваёй сцэне «Кола шчасця» братоў Тур, «Вечна жывыя» В. Розава. Студэнцкі гурток узначальвае артыст Магілёўскага абласнога тэатра С. Каленскі.

Калектыў ажыццявіў пастаноўку «Кухаркі» Анатоля Сафронава. З гэтым спектаклем самадзейныя артысты выступалі на прадпрыемствах горада, у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Гледачам спадабаліся вобразы дзеда Слівы (А. Емяльянаў), Паўліны (Н. Сіманава), Андрэя Пчолкі (А. Шалута). Хутка драмгурток пакажа гледачам сваю новую работу—трагедыю Шэкспіра «Рамео і Джульета».

НАСУСТРАЧ ЧЭХАЎСКІМ ДНЯМ

У адным з апошніх нумароў насценная газета «Голас філолага» аб'явіла конкурс на лепшы верш, прысвечаны Чэхаву, на лепшыя ілюстрацыі да яго твораў, на лепшага выканаўцу твораў А. Чэхава.

Студэнты рыхтуюць літаратурна-мастацкі вечар, на якім гледачы ўбачаць любімыя вобразы з твораў вялікага пісьменніка.

Намячаецца правесці студэнцкую навуковую канферэнцыю, дзе будуць прачытаны даклады студэнтаў IV курса філфака: К. Краўцовай «Эстэтычныя погляды Чэхава», Л. Інуковай «Вобраз настаўніка ў творах Чэхава», Г. Кубліцкай «Чэхаў і тэатр».

Студэнты інстытута прымуць удзел у агульнагарадскім конкурсе на лепшага выканаўцу твораў класіка рускай літаратуры. Да конкурсу рыхтуецца літаратурна-музычная кампазіцыя, прысвечаная жыццю і творчай дзейнасці А. Чэхава.

М. КАЗАКОЎ.

Размова пра жывапісца

У Саюзе мастакоў былі абмеркаваны творы маладога мастака А. Малішэўскага. Гэта ў асноўным эцюды, зробленыя на Балтыйскім узбярэжжы і ў ваколіцах Мінска.

З аглядам выстаўленых твораў выступіў М. Савіцкі.

— У пейзажах Малішэўскага,— гаворыць прамоўца,— добра адчуваецца плеэр, паветра, мясцовы коларыт. Па яго эцюдах лёгка здагадацца, дзе яны былі напісаны. Творчая мова мастака простая і лаканічная. Ён не пасіўна капіруе натуру, а актыўна ўступае ва ўзаемадзеянне з прыродай, імкнецца стварыць сінтэтычны вобраз роднай прыроды. Гэта добра адчуваецца ў пейзажы «Мінчына».

Дакладчык станоўча адгукаецца і аб пейзажах «Рыбацкія лодкі», «З улову», «Рыбацкая гавань». Гэтыя творы, напісаныя ў срабрыста-шэрай гаме, перадаюць вільготнасць марскога паветра, працоўнае напружанне рыбацкага калектыву. Значнае месца на выстаўцы займаюць рабочыя эцюды да новай карціны мастака, у якой аўтар хоча адлюстраваць радасць творчай працы беларускіх жывёлаводаў.

Але творы мастака не пазбаўлены і недахопаў. Да іх адносіцца перш за ўсё не зусім выразная псіхагалічная характарыстыка персанажаў. Захапіўшыся дэкаратыўна-каляровым выражэннем пастаўленай задачы, мастак забывае аб унутраным свеце герояў. Залішняя манернасць і абыякавасць да мастацкай формы часам дрэнна адбіваецца на матэрыяльнасці прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Гэта добра відаць у «Асеннім нацюрморце», дзе выдатна напісаны, кветкі і вельмі неахайна — збанок.

Не заўсёды дакладнае і каляровае вырашэнне. Так, напрыклад, колер марской вады ў эцюдзе «З улову» хутчэй нагадвае Чорнае, а не Балтыйскае мора. Колер снегу ў пейзажы «Сакавік» вельмі падобны да колеру пяску вышэй названага эцюда. Няўдалае суседства (пейзажы экспанаваны побач) яшчэ больш узмацняе гэтае ўражанне.

А. Волкаў ухваляе пейзажы «Мінчына», «Рыбачая гавань» і інш., але ў той жа час ён зрабіў слушныя заўвагі па малюнку ў некаторых эцюдах Малішэўскага.

В. Волкаў лічыць, што ў работах Малішэўскага мала ўвагі ўдзяляецца чалавеку.

— Мяне здзіўляе,— гаворыць мастак,— што ў Малішэўскага побач з добрымі, прыгожа напісанымі эцюдамі сустракаюцца і такія, як партрэт Н. А. Максімчанкі, вельмі далёкія ад жыццёвай праўды. Колер гэтых эцюдаў манерны, надуманы. Зусім не зразумела, якую ідэю імкнецца адлюстраваць мастак у такім творы.

Слушным было выступленне дырэктара Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута В. Цвіркі, які адзначыў, што ў работах некаторых сучасных беларускіх мастакоў (у тым ліку і ў А. Малішэўскага) наглядаецца імкненне да вонкавай прыгажосці. Гэта, вядома, пакідае нейкае ўражанне ў гледача. Але такія малазмястоўныя, разлічаныя на вонкавы эфект, творы хутка забываюцца.

— Зараз перад мастакамі,— гаворыць В. Цвірка,— стаяць праблемы закончанасці і павелічэння прафесіянальнага майстэрства. Вырашаць іх патрэбна неадкладна. Ён цалкам падтрымаў В. Волкава і заклікаў мастакоў звярнуць сур'ёзную ўвагу на форму і змест сваіх твораў.

У дыскусіі таксама прынялі ўдзел Х. Ліўшыц, П. Гаўрыленка і інш.

У слове ў адказ А. Малішэўскі выказаў падзяку за заўвагі, зробленыя ў яго адрас.

Л. ДРОБАЎ.

На экранах у студзені

Звыш 20 савецкіх і замежных мастацкіх фільмаў будзе дэманстравацца на экранах нашай рэспублікі ў студзені новага 1960 г.

З цікавасцю сустрэнуць гледачы кінааповесць «Людзі на мосце», створаную вядомым савецкім кінарэжысёрам Аляксандрам Зархі па сцэнарыю пісьменніка і драматурга Сяргея Антонава.

Алмаацінскія кінематаграфісты выпускаюць у студзені фільм «Шквал», у якім расказваецца аб лёсе капітана сэйнера Ермака.

У аснову новай кінааповесці «На зялёнай зямлі маёй» (вытворчасць Адэскай кінастудыі) пакладзена гісторыя барацьбы жыхароў аднаго сяла супраць карыслівых планаў дырэктара закарпацкага леспрамгаса Кірылюка.

«Зоркі сустракаюцца ў Маскве» — так называецца карціна, прысвечаная Міжнароднаму кінафестывалю, што праходзіў у жніўні 1959 г. у сталіцы нашай Радзімы.

Не без цікавасці будзе глядзецца фільм Талінскай студыі «Капітан першага рангу», створаны па матывах аднайменнага рамана А. Новікава-Прыбоя.

Кінакамедыя «Стары коннік» (рэжысёр-пастаноўшчык Барыс Барнэт) раскажа аб жыцці прафесіянальнага 64-гадовага конніка Івана Сяргеевіча Трафімава.

Кінастудыя «Масфільм» (СССР) і Балгарская студыя мастацкіх фільмаў выпускаюць экранізацыю вядомага рамана Тургенева «Напярэдадні».

Кінакарціна «Вядзьмарка» створана на кінастудыі «Ленфільм» рэжысёрам Аляксандрам Абрамавым па аднайменнаму апавяданню Антона Паўлавіча Чэхава.

Аб жыцці і дзейнасці заснавальніка асецінскай літаратуры Косты Хетагурава раскажа гледачам другі фільм Ленінградскай кінастудыі — «Сын Ірыстона». Ролю Косты выконвае артыст В. Тхапсаеў.

З замежных кінематаграфічных твораў у нас будуць дэманстравацца: японская шырокаэкранная кінакарціна «Чалавек-рыкша», нямецкая кінакамедыя «Цяжар», французскі прыгодніцкі фільм «У свеце маўклівасці», англійскі —«Чалавек у кароткіх штоніках», польскі — «Гісторыя аднаго знішчальніка», індыйскі—«Кабумец» і інш.

Будзе паказана шмат новых навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

На здымку: кадры з фільмаў «Напярэдадні» і «Шквал».

І. ПЯТРОЎ.

ДОБРЫ ПАЧАТАК

У Мінскім музычным вучылішчы сістэматычна праводзяцца сольныя канцэрты педагогаў. Нядаўна адбыўся канцэрт педагогаў па класу вакалу Веры Фамічэнкі. У недалёкім мінулым яна — выпускніца Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі. Яшчэ будучы студэнткай Вера Фамічэнка часта выступала ў канцэртах і па радыё. Мінчанам добра знаёма яе густое сакавітае меца-сапрана. Выкананне В. Фамічэнкі заўсёды адрозніваецца ўдумлівасцю і імкненнем глыбока пранікнуць у змест твора.

Першае аддзяленне было прысвечана творам Чайкоўскага, другое аддзяленне — Рахманінава. Праграма была вельмі вялікая — В. Фамічэнка праспявала за вечар больш дваццаці рамансаў. Перад спявачкай узніклі вялікія цяжкасці з-за аднапланавасці праграмы — большасць рамансаў блізкія паміж сабой па настрою, вобразах, сродках выяўлення,—і гэта, несумненна, магло прывесці да аднастайнасці ў выкананні, да таго, што спявачка магла, як кажуць, усё «прычасаць пад адзін грэбень». Аднак, В. Фамічэнка ў асноўным пераадолела гэтыя цяжкасці, здолеўшы знайсці для многіх рамансаў свае індывідуальныя сродкі выяўлення, раскрыць іх тонкую своеасаблівасць і адлюстраваць найменшыя адценні пачуццяў.

З вялікай перакананасцю В. Фамічэнка перадала глыбокі драматызм і глухі смутак рамансаў Чайкоўскага «Толькі ты адзін» (словы Пляшчэева), затоены сум рамансаў Чайкоўскага «Ні слова, о, друг мой» (словы Пляшчэева). Глыбока паэтычна і тонка праспявала артыстка даволі рэдка выконваемыя ў нас лірычныя рамансы Рахманінава «Раніца» (словы Янава), «Ноччу ў садзе ў мяне» (словы Блока), «Сон» (словы Пляшчэева).

Бясспрэчнай удачай у канцэрце В. Фамічэнкі з'явілася выкананне некаторых рамансаў Чайкоўскага і Рахманінава, напісаных у духу рускай народнай песні. У іх творчая індывідуальнасць В. Фамічэнкі раскрываецца ярчэй і глыбей, у голасе артысткі паяўляюцца новыя фарбы, спяванне яе становіцца больш дынамічным і выразным. Гэта адносіцца да рамансаў Чайкоўскага «Я ли в поле да не травушка была» (словы Сурыкава), які прагучаў пранікнёна, да рамансаў Рахманінава «Уж ты, мила моя» (словы А. Талстога) і «Полюбила я на печаль свою» (словы Пляшчэева).

Менш удаліся В. Фамічэнка тыя творы, у якіх выказваюцца бурныя душэўныя парывы, напружаная псіхалагічная барацьба. Так, у рамансе Чайкоўскага «То было раннею весной» (словы Талстога) яўна не хапала характэрнай для яго лірыка-драматычнай усхвалянасці, парывістасці. Адсюль ураўнаванне некаторай статычнасці і халаднаватасці выкання. Тое ж самае адзначаецца і ў рамансе Чайкоўскага «В эту лунную ночь» (словы Ратгауза), і ў рамансах Рахманінава «В молчаньи ночи тайной» (с. Фета) і «Я жду тебя» (словы Да... давай). Таму не дзіўна, што тэмпы падобных твораў былі часта запаволеныя.

Голас В. Фамічэнкі не аднолькавы роўны ва ўсім яго дыяпазоне. Верхні рэгістр тучыць у яе крыху рэзка, т... пружана. Гэта перашкодзіла спяваць... цы перадаць светлую лірыку рамана... Чайкоўскага «Подожди» (словы Г... кава), гэта ж прыяло да асобн... наяўдач і ў рамансе Чайкоўс... «Снова, как прежде один» (сл... Ратгауза).

Пры выкананні некаторых тво... была прыкметна інтанацыйная не... кладнасць, як, напрыклад, у рамане... Чайкоўскага «На нивы жёлтые» (сл... вы А. Талстога), аднак гэта да... В. Фамічэнкі не характэрна.

Добра правяла фартэпіянную пар... тыю педагог вучылішча А. Багдана... ва. Праўда, іншы раз акампаніямент быў крыху гучнаваты, але нельга не адзначыць галоўнае — цесны творчы кантакт спявачкі і акампаніятара.

На здымку: спявае Вера Фамічэнка.

У цэлым канцэрт В. Фамічэнкі пакінуў добрае ўражанне. Ён сведчыць аб павышэнні майстэрства спявачкі.

Канцэрты педагогаў музычнага вучылішча—добры пачатак, які прыносіць вялізную карысць не толькі студэнтам, але і самім педагогам, актывізуючы іх творчы рост. Дзіўна, што канцэрты педагогаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі наладжваюцца намнога радзей, а кансерваторыя ж павінна паказваць прыклад вучылішчу. Хочацца пажадаць, каб падобныя канцэрты наладжваліся часцей, і каб іх больш актыўна наведвалі не толькі музыканты-прафесіяналы, але і аматары музыкі.

Н. КАЛЕСНІКАВА.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«Пісьменнік прыйшоў у бібліятэку»

Старшы інспектар упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР тав. Крупенька ў сувязі з артыкуламі М. Масенжыка «Пісьменнік прыйшоў у бібліятэку» («Літаратура і мастацтва» № 87, 1959) і А. Махнача «Давайце працаваць разам» (№ 89, 1959) паведамляе рэдакцыі, што Міністэрства культуры БССР намеціла захады па выпраўленню ў бібліятэчнай рабоце недахопаў, закранутых у артыкуле.

Так, з 1960 г. усе навуковыя, абласныя і цэнтральныя гарадскія бібліятэкі будуць атрымліваць абавязковы экземпляр усіх выданняў рэспублікі. Дзяржаўная бібліятэка імя Ул. І. Леніна штомесячна выдае дапамогу масавым бібліятэкам рэспублікі спіс беларускай літаратуры.

У студзені 1960 г. адбудзецца рэспубліканская міжведамасная канферэнцыя бібліятэчных работнікаў. На канферэнцыю мяркуецца запрасіць пісьменнікаў, каб абмяняцца з імі думкамі аб сумеснай рабоце па прапагандзе мастацкай літаратуры.

ДЛЯ ЮНАГА ГЛЕДАЧА

Мастацкі савет Тэатра юнага гледача абмеркаваў пытанне пра мастацкае абслугоўванне школьнікаў у час зімовых канікул. Савет вырашыў, акрамя спектакляў, якія будуць паказаны дзецям, наладзіць каля прыгожа прыбранай ёлкі выступленні дзеда мароза, снягурачкі, зацейніка, баяніста і іншых сяброў дзеда мароза.

У час канікул юныя гледачы ўбачаць паэтычную казку «За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля, вядомую інсцэніроўку «Прыгоды Чыпаліна» Дж. Радары, спектаклі «Сябры» В. Зуба і Ю. Багушэвіча, «Вострaў скарбаў» па Сцівенсону, «Валавяныя пярсцёнкі» Т. Габэ і інш.

Старшакласнікам будуць паказаны спектаклі «Не верце цішыні» І. Шамякіна, «У пошуках радасці» В. Розава, «Час любві і нянавісці» Я. Пасава.

Гастролі Ленінградскага тэатра камедыі

У Мінск упершыню прыязджае на гастролі Ленінградскі тэатр камедыі. Мінчанам тэатр пакажа камедыю В. Шкваркіна «Простая дзяўчына». У спектаклі прымуць удзел заслужаныя артысты РСФСР С. Філіпаў, К. Злобін, А. Сяргеева, В. Чобур, а таксама таленавітыя артысты Е. Жараў, Я. Вайткевіч, В. Раманаў, В. Осіпаў, О. Парудалінская і інш. Галоўны рэжысёр тэатра — народны артыст РСФСР М. Акімаў.

Гастролі адбудуцца ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў у пачатку студзеня 1960 г.

ПАНІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

зінам машыну і запасны каністр, які прыхоўваў на ўсялякі выпадак.

Мяне здзівіла вялікая колькасць аўтамашын, гружаных паходным снаражэннем, якія імчаліся на поўдзень. Можна было падумаць, што надыйшла пара вялікодных водпускаў. Але больш за ўсё мяне ўстрывожыла тое, што на ўсіх заправачных станцыях віселі замкі.

Калі я вярнуўся дамоў, жонка сказала, што па радыё перадавалі экстранае паведамленне: а палове другой са спецыяльнай заявай выступіць прэм'ер штата. Не было вялікай ахвоты есці святочны абед, а тут яшчэ кожныя пяць мінут паўтаралася экстранае паведамленне.

Досан прыйшоў, калі мы ўжо мылі талеркі, і сказаў, што неадкладна едзе са сваімі пасажырамі на вёску: ад аднаго саслужыўца ён чуў, што хутка будзе аб'яўлена экстраная эвакуацыя і яны хочуць паехаць яшчэ да пачатку «мітусні».

Мы парашылі ўсё ж дачакацца заявы. Праўда, мы амаль вар'яцелі ад сумненняў, але ўвесь час супакойвалі сябе, гаворачы, што ўрад не прымусіць нас чакаць, калі раптоўна ўзнікне пагроза выбуху.

Прэм'ер штата, як і прэм'ер-міністр, пачаў са сцвярджэння, што няма аніякіх падстаў для панікі. Ён растлумачыў, што ўвесь час падтрымлівае кантакт з прэм'ер-міністрам, а таксама з экспертамі, якія паехалі на месца здарэння і ў склад якіх уваходзяць людзі, што спецыяльна прыляцелі са Злучанага Каралеўства.

Да пачатку «выдалення» бомбы была праведзена ўсебаковая экспертыза. Большасць спецыялістаў пагадзілася з тым, што зараз нельга ўпэўнена сказаць, ці зусім бяспечна выкопваць бомбу. Карацей кажучы, з работамі па выдаленню бомбы звязана рызыка дэтанацыі — ў выпадку не амаль уся тэрыторыя сталіцы штата будзе цалкам знішчана, а навакольныя раёны падвергнуцца небяспечнаму для жыцця людзей заражэнню.

Каб захаваць як мага большую колькасць людскіх жыццяў, неабходна правесці поўную эвакуацыю горада і навакольных раёнаў у радыусе не менш пяцідзесяці міль.

Ён добра разумее тыя вялікія нявыгады і страты, якія пацягне за сабой эвакуацыя, асабліва для гандлю і прамысловасці, але лічыць, што бяспеку амаль чатырохсот тысяч чалавек трэба паставіць вышэй за ўсялякія іншыя інтарэсы. Да пачатку работ насельніцтву будзе дадзена сорак чэм гадзін на эвакуацыю.

Прэм'ер папрасіў уладальнікаў машын супрацоўнічаць з паліцыяй. Вясковае насельніцтва заклікалася ўсяляк дапамагаць эвакуіраваным кватэрамі і ежай. У выпадку дэтанацыі шлях радыяактыўнага воблака будзе пільна прасочан і ўлады зробяць усё магчымае, каб папярэдзіць людзей, што будуць знаходзіцца яшчэ ў дарозе.

Прэм'ер зноў параіў захоўваць спакой, а затым перадаў слова дыктару, які пачаў чытаць падрабязны спіс падрыхтоўчых мерапрыемстваў і агульнакарысных парад. Тут гаварылася і пра чыгуначныя мерапрыемствы, пра планы эвакуацыі бальніц, пра адзенне, догляд хатняй жывёлы ў дарозе, сельскія пункты размену грошай, засцерагальныя меры адносна электрапрыбораў, даваліся парады цяжарным жанчынам, аб'яўлялася пра закрыццё атэляў, судовых і ўрадавых устаноў да спецыяльнага паведамлення. Дыктар яшчэ не скончыў чытаць гэты спіс, як мы ўжо рушылі ў дарогу.

Першая гадзіна нашага падарожжа яшчэ і цяпер паўстае ў маёй памяці, як нейкая блытаніна пачуццяў і вобразаў. Наша маленькая машына была страшэнна перагружана. Жонка з грудным дзіцём сядзела наперадзе. Двое нашых хлопчыкаў неяк прымасціліся на заднім сядзенні сярод чамаданаў і розных хатніх рэчаў, якія ўвесь час спаўзалі мне на галаву і плечы, перашкаджаючы кіраваць машынай.

Усе чатыры каляны шашы былі заняты транспартам, які імчаўся на поўдзень. Рух быў такі густы, што нам давялося пачакаць мінут дзесяць, перш чым мы далучыліся да яго.

Я вёў машыну амаль аўтаматычна — тармазіў, пераключаў скорасці, сігналіў разам з усім гэтым грымучым патокам. Я ўвесь час успамінаў кадры кінахронікі аб ядзерных выбухах, малюючы сабе асляпляльную белую ўспышку і велізарны жудасны клуб пылу, які імкліва ўзлятае ў неба і які ніколі, нават і прыблізна, не нагадваў мне грыб. Я паспрабаваў уявіць сабе, як ён нясецца над хацінамі і садамі на адлегласці многіх-многіх міль; мне нават здалося, што я ўбачыў, як ён спапяляе мае ружы, наш дом, мае кнігі...

Калі мы выбраліся, нарэшце, з цесных вуліц аднаго маленькага гарадка і паехалі крыху хутчэй, я трохі супакоіўся. Здавалася, што пачуццё палёгкі ахапіла ўсіх. Вадзіцелі сталі больш ветлівымі і паслужлівымі. Мы чулі, як яны крычалі ў бок машын, што сабраліся на краі дарогі: «Ну як, усё ў парадку, прыяцель?»

Гэты настрой рабіўся агульным. Неўзабаве ўжо і нашы дзеці пачалі пранозліва крычаць: «Ну як, усё ў парадку, прыяцель?»

І таму не было нічога дзіўнага ў тым, што я прытармазіў машыну, калі чалавек, які стаяў на абочыне, памахаў мне рукой.

— Прабачце, што турбую вас, прыяцель. Можа, у вас ёсць інструкцыя Морыса? — ён шматзначна паляпаў далонню па капоту нашай машыны. На шчасце, у скрынцы для рукавіц у мяне ляжала гэтая інструкцыя, і я дастаў яе адтуль.

— Што, сапсавалася? — спытаўся я тонам вялікага знаўцы.

— У бензапомпе нейкае глупства. Дай, думаю, сам выпраўлю, дастаць бы толькі інструкцыю.

Я прыгадаў, як некалькі месяцаў назад я засеў на дарозе з такой жа прычыны і чалавек з аўтамабільнага клуба адразу ліквідаваў непаладку.

— Дайце гляну, — сказаў я і, сышоўшы, накіраваўся ў бок невялічкага «Морыса». На ім было напісана: «А. Э. Джэфрыс, земляныя работы і бульдазяроўка». Уперадзе сядзела жанчына з дзіцем на руках. Калі я наблізіўся, яна ўсміхнулася. Двое больш дарослых дзяцей таксама ўсміхнуліся мне.

Я папрасіў гаспадара машыны ўключыць запальванне і трохі пакруціў туд-сюд канцы бензапомпы. Раптам у машыне пачулася пашчоўкванне: значыць, я ліквідаваў няспраўнасць. Я з сур'ёзным выглядам кіўнуў галавой, гаспадар запусціў старцёр, і матор роўна і мерна загуў.

— О'кэй! — аўтарытэтна прамовіў я.

Ён выключыў матор і пачаў мне дзякаваць. Я каротка растлумачыў, у чым была справа, але не спяшаўся вяртацца да сваёй машыны. Мне так і карцела пагаварыць з гэтым чалавекам.

— Вось дык паніка, а?— я паказаў пальцам на бясконцую стужку аўтамашын, што імчалася міма нас.

— Шчэ і якая. А мяне, калі ўсё гэта вытхнецца, найначай, часадзяць.

— Як? — здзівіўся я. І ва мне прачнулася прафесіянальная цікаўнасць. — А што такое?

— Бачыце, у мяне невялічкая бульдозерная справа. У суботу з Камітэта Атамнай Бяспекі, ні як там яго велічаюць, мне брынкнулі па тэлефоне: «Містэр Джэфрыс, — кажуць, — мы хочам рэквізаваць ваш бульдозер». «Навошта?» — пытаюся. «На выпадак заўчаснага выбуху бомбы. Адной з важнейшых нашых праблем будзе масавае выкопванне трупаў. Для гэтай мэты спатрэбіцца любое наўпрыдатнае землекапальнае абсталяванне». «Частуйцеся самі, — кажу я, — маёй нагі тут не будзе». «Але, містэр Джэфрыс, — кажуць яны,—мы спадзяёмся, што вы застанецеся, каб кіраваць сваім бульдозерам». А я ім: «Вы можаце кіраваць ім, паны дабрадзеі, самі. У мяне жонка і дзеці. Гэта ж ваша бомба, ну дык і трымайцеся, калі ласка, за яе. А я выходжу з гульні».

На самай справе прамова містэра Джэфрыса была крыху больш крамольнай, чым можна тут напісаць. Мне ўдалося запэўніць яго, што ён не парушыў ніякіх законаў, калі адмовіўся аддаць сябе ў распараджэнне ўлад на той няпэўны выпадак, калі пасля выбуху ён застанецца жывы. Я хацеў аднак сказаць, што хутчэй за ўсё ён пападзе ў бяду за свае неасцярожныя словы, але палічыў за лепшае змаўчаць.

На ферму мы прыехалі позна ўночы. Жончына цётка сустрэла нас на дзіва гасцінна (а да нас жа ў яе пасяліліся ўжо дзве сям'і!).

Тыдзень прайшоў даволі прыемна. Не трэба было непакоіцца аб службе, і наогул усё гэтае грамадства канкурэнцыі мела, нарэшце, прычыну крыху адпачыць.

Ферма добра задавольвала нашы апетыты. На ёй выраблялася амаль усё неабходнае. Мы, гарадскія жыхары, адплочвалі за гасціннасць як маглі, ахвотна прымаючы ўдзел у пасільнай для нас працы. Вечарамі збіраліся каля радыёпрыёмнікаў і слухалі апошнія паведамленні пра «выдаленне» бомбы, якія перадаваліся па меры таго, як эксперты пры дапамозе армейскіх добраахвотнікаў дзюйм за дзюймам дабіраліся рыдлёўкамі да яе.

К таму часу, як усё скончылася і бомбу кінулі далёка ў мора, усе мы адчулі, што не дарэмна правялі гэты тыдзень вымушанага адпачынку.

Падарожжа назад нагадвала гіганцкі масавы пікнік на колах. Гулі ражкі аўтамашын, свісталі паравозы, пасажыры высоўваліся з акон вагонаў, махалі рукамі і нешта крычалі аўтамабілістам.

Ніколі раней сельскія гасцініцы і заправачныя станцыі не мелі такога прыбытку.

Але родныя мясціны не ўсіх сустрэлі ласкава. Электразамыканні і навыключаныя электрапрыборы выклікалі мноства пажараў, а знаходжанне ў дарозе і дрэнная ежа былі прычынай шматлікіх захворванняў. Рамяство, гандаль, прамысловасць панеслі мільённыя страты.

На сваю адвакацкую прафесію не давялося скардзіцца. Акрамя астранамічных грашовых іскаў да ўрада Садружнасці, было вялікае мноства самых разнастайных судовых працэсаў, безліч розных іскаў застрахаваных ад пажараў, нязчасных выпадкаў, дарожных катастроф, ад электрычнай кампаніі штата за патравы, п... рушэнні кантрактаў, пратэрміноўку кватэрн... платы. Узбуджалася безліч судовых праслед... ванняў за ашуканства, разбой, пакражы, пак... данне дзяцей. Самымі шматлікімі былі шлюба... разводныя працэсы, прычым выстаўляліся вельм... пераканальныя доказы сямейных здрад.

Супраць майго знаёмага ўдзельніка... містэра Джэфрыса ніякіх судовых праследаванняў не было. А то б я, паверыце, зусім бясплатна прапана... ваў свае паслугі, хоць, па праўдзе, не вельмі люблю крымінальныя справы.

Юрыдычная калегія на тым тыдні абмяркуе прапанову, выстаўленую адным з нашых найбольш радыкальных адвакатаў:

«Каб урад Аўстралійскай Садружнасці панёс адказнасць і выплаціў поўную кампенсацыю за ўсе страты, прамыя ці ўскосныя, якія звязаны з эвакуацыяй».

Мне думаецца, гэтая частка прапановы пройдзе аднагалосна; сумненні выклікае толькі другая частка:

«Каб урад адмовіўся ад удзелу ў любых падобных выпрабаваннях і накіраваў ашчаджаныя такім чынам грошы на выплату вышэй названай кампенсацыі».

Што больш за ўсё мяне непакоіць — дык гэта пытанне: ці павінен просты грамадзянін умешвацца ў справы, што датычаць бяспекі Імперыі?

Пераклаў з англійскай мовы.

С. ДОРСКІ.

Наступны нумар газеты «Літаратура і мастацтва» выйдзе 31 снежня г. г.

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОРСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Пятро ІПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага т